ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарэкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 118 (4370)
СУБОТА, 28 мая 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

РАПАРТ ПЕРАМОГІ

Жыткавіцкі раён першым выканаў і перавыканаў пасеўны плян

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ, Наркамзем—тав. РАЧЫЦКАМУ, ЦО КП(б)Б—„ЗЬВЯЗЬДЗЕ"

27 МАЯ ЖЫТКАВІЦКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛЯН СЯЎБЫ, ВЫЗНАЧАНЫ НАРКАМЗЕМАМ, НА 102 ПРОЦ. ЗАСЕЯНА 9.222 ГЭКТ. БУЛЬБЫ ЗАСЕЯНА 107 ПРОЦ. ПЛЯНУ, ІЛЬНУ—111 ПРОЦ., АЎСА—113 ПРОЦ. ЗМАГАЕМСЯ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ СУСТРЭЧНАГА ДА 30 МАЯ.

Сакратар РК КП(б)Б і старшыня пасеўтройкі—**Багданаў.** Старшыня РВК—**Будзько.** Райза—**Буянаў**

Шырэй разгарнуць палітычна-масавую работу на вёсцы

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове «Аб рабоце калгаснай ячэйкі ў сувязі з веснавой сяўбой» даў указаньне ўсім партыйным арганізацыям, што «важнейшай умовай у справе пасьпяховага разгортваньня і правядзеньня веснавой сяўбы зьяўляецца арганізацыйнае замацаваньне і сапраўднае разгортваньне партыйна-масавай работы калгаснай ячэйкі».

Гэта важнейшая ўмова пасьпяховай барацьбы ня выканана яшчэ радам мясцовых арганізацый КП(б)Б. Партыйна-масавая работа вакол задач трэцяй бальшавіцкай вясны, па растлумачэньні калгасьнікам і аднаасобнікам пастаноў партыі і ўраду аб збожжа і жывёлазагатоўках, аб разгортваньні калгаснага гандлю — у радзе месц разгорнута слаба. Іменна слабасьцю партыйна-масавай работы ў некаторых раёнах у значнай ступені тлумачыцца тое, што пляны сяўбы ў гэтых раёнах выконваюцца надзвычай марудна (**Рэчыцкі, Чачэрскі** і інш.).

Некаторыя парт'ячэйкі ня толькі не арганізавалі бальшавіцкай барацьбы за сяўбу, ня толькі ня сталі на чале ўзросшай актыўнасьці мас, а нават апынуліся ў палоне апартуністычнай стаўкі на самацёк, у палоне ня вартай бальшавікоў благадушнасьці да маруднага ходу палявых работ. Яркім прыкладам гэтаму служыць Алесаўская ячэйка КП(б)Б (**Полацкі раён**). Яна ня толькі не разгарнула змаганьня за выкананьне пляну веснавой сяўбы, а стала на шлях скарачэньня пасеву **тэхнічных культур. У саўгасе імя Будзённага** (Менскі раён) яшчэ не прыступілі да пасадкі бульбы. Партыйная ячэйка не разгарнула масавай работы па растлумачэньні шырокім масам рабочых задач партыі ў трэцюю бальшавіцкую вясну. У гэтым саўгасе ў паяўнасьці факты, ня вартыя савецкай гаспадаркі. На працягу мая там быў рад выпадкаў прагулаў. Гэтыя прагулы ў такі адказьнейшы момант характарызуюць дрэнную работу партыйнай ячэйкі. Недапушчальную бязьдзейнасьць правяла і партыйная ячэйка саўгасу «**Перамога сацыялізму**» (**Хойніцкі раён**). Гэта ячэйка ня ставіла на практычнае вырашэньне пытаньняў вытворчасьці, не давяла пасеўных плянаў да шырокіх рабочых мас.

Некаторая частка вясковых ячэек КП(б)Б не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі, не аўладала мэтадамі канкрэтнага кіраўніцтва. Рад ячэек працягвалі працаваць і кіраваць па-старому ў зусім новай абстаноўцы і зусім новых умовах. Сям-там пераважвае яшчэ мэтад кампанейшчыны, мэтад разавага «эпізадычнага націску», якія зьмяняюцца доўгім заціншам. Між тым, як рэалізацыя надзвычай вялікіх і складаных задач партыі, пастаўленых у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, патрабуюць узмоцненай, глыбокай работы.

Задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, стварэньня і работы вытворчых брыгад — гэтыя важнейшыя задачы патрабуюць глыбокай сыстэматычнай работы па іх вырашэньні. Або возьмем пытаньне павышэньня ўраджайнасьці, пытаньне барацьбы за якасныя паказальнікі сельска - гаспадарчай вытворчасьці. Выкананьне гэтай важнейшай задачы немагчыма мэтадам разавага націску, мэтадам кампаніі. Тут патрэбна напружаная сыстэматычная работа па ажыцьцяўленьні цэлага раду практычных мерапрыемстваў, глыбокая масавая работа па прапагандзе задач барацьбы за якасьць, за аўладаньне агратэхнікай на працягу доўгага перыяду. Іменна так партыя ставіць пытаньне.

Некаторыя мясцовыя партарганізацыі, аднак, гэту работу правялі нездавальняюча, ня так, як патрабавала партыя. І таму яны апынуліся ў глыбокім тыле пасеўнага фронту, у выніку мы зараз сустракаемся з фактамі прастою трактараў з прычыны дрэннага рамонту, з фактамі няпоўнага скарыстаньня цягавай сілы, з прычыны яе дрэннай падрыхтоўкі да вясны.

Партыйныя ячэйкі поўнасьцю ў першую чаргу адказваюць перад партыяй за становішча сяўбы. Ад іх партыя зараз патрабуе карэннага пералому ў фарсаваньні палявых работ. А гэтага нельга дабіцца бяз шырокай **масавай работы,** сканцэнтраванай у пізавым вытворчым зьвяне, брыгадзе, групе дастасоўна да паасобных катэгорый калгасьнікаў і сярод працоўных аднаасобных сяляк.

«Памылкова было-б думаць, што члены калгасаў ператварыліся ўжо ў сацыялістаў. Не, нам прыдзецца яшчэ шмат працаваць над тым, каб перарабіць селяніна - калгасьніка, выправіць яго індывідуалістычную псыхалёгію і зрабіць з яго сапраўднага працаўніка сацыялістычнага грамадзтва» (**Сталін**). Перавыхаваньне калгасьніка, перамаганьне яго дробна - ўласьніцкай ідэалёгіі, дробна-буржуазных забабонаў, фармаваньне з яго стойкага барацьбіта за поўную перамогу сацыялізму — надзвычай адказная задача. Яе ажыцьцяўленьне патрабуе ўзмоцненай і доўгай работы партыйных арганізацый. Задача кожнага камуніста, кожнай партыйнай ячэйкі і райпартарганізацыі шырока перад сабой ставіць пытаньні перавыхаваньня калгасьнікаў, разгортваць клясава-выхаваўчую работу.

Бальшавіцкая палітычна - масавая работа, агітацыя і прапаганда ня ёсьць голае асьветніцтва, ва што імкнуўся ператварыць яе апартуністы ўсіх колераў. Бальшавіцкая агітацыя і прапаганда, масавая і выхаваўчая работа сярод калгасных мас, праводзімая ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, мае перад сабой мэту — мабілізаваць масы па вырашэньне задач, пастаўленых партыяй. Значыць, справа заключаецца ў тым, каб праз прапаганду генэральнай лініі партыі згуртаваць калгасьнікаў, накіраваць іх узросшую актыўнасьць на далейшае папярэдняе с.-г. вытворчасьці, на поўнае колькаснае і якаснае выкананьне пасеўных плянаў.

Пастановы ЦК і СНК аб загатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю, з пашырэньнем яго матар'яльнай базы ўжо зараз у бягучую вясну на аснове поўнага выкананьня пасеўных плянаў.

Выкананьне плянаў сяўбы, папулярызацыя ў масах пастаноў ЦК і СНК, іх неаскладнае правядзеньне ў жыцьцё — гэтыя задачы вызначаюць характар і зьмест палітычна-масавай работы. Гэтым вузлавым задачам трэба падначаліць усе віды, формы і мэтады партыйна-масавай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў.

Вясковыя партарганізацыі на сёнешні дзень маюць у сваім распараджэньні магутныя сродкі разгортваньня масавай работы. Тысячы экзэмпляраў кніг, брашур, рост пізавога друку, радыё, кіно-перасоўкі і г. д. — усё гэта магутныя вагары палітычнага клясавага выхаваньня калгасных мас. Трэба толькі гэтыя сродкі скарыстаць, падначаліць задачам пасьпяховага правядзеньня трэцяй бальшавіцкай вясны, задачам рэалізацыі пастаноў ЦК і СНК аб загатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю.

Разгортваньне палітычна - масавай работы, падначаленьне яе ажыцьцяўленьню гэтых вузлавых задач патрабуе непрымірымага змаганьня на два фронты — супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць прымірэнцаў да ўхілаў ад бальшавізму.

Шырэй палітычна - масавую работу на калгасных палёх, у вытворчай групе і брыгадзе, сярод працоўных аднаасобнікаў. У гэтым адна з важнейшых умоў нашых перамог на пасеўным фронце.

ХАРКАЎСКАМУ ТРАКТАРНАМУ І ЯГО ЛЕПШЫМ УДАРНІКАМ—ОРДЭН ЛЕНІНА

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР аб узнагародзе ордэнам Леніна Харкаўскага трактарнага заводу імя Серго Арджанікідзэ і асобных работнікаў гэтага заводу і занясеньні на дошку гонару арганізатараў будаўніцтва заводу

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанаўляе:

I.

За шпаркае асваеньне вытворчага працэсу і датэрміновае давядзеньне вытворчасьці да 100 трактараў у дзень узнагарадзіць Харкаўскі трактарны завод імя Серго Арджанікідзэ ордэнам Леніна.

II

За асабліва выдатныя заслугі кіраўнікоў і рабочых Харкаўскага трактарнага заводу імя Серго Арджанікідзэ па шпаркім асваеньні вытворчага працэсу і давядзеньне выпуску трактараў у больш кароткі тэрмін супроць пляну да 100 трактараў у дзень узнагарадзіць ордэнам Леніна наступных рабочых і кіраўнікоў з адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводу:

1. **СЬВІСТУНА П. І.**, дырэктара заводу, б. начальніка будаўніцтва—за ўмелую арганізацыю работ па будаўніцтве заводу і кіраўніцтва барацьбой заводзкага калектыву, за шпаркае аўладаньне тэхнікай вытворчасьці.

2. **БРУСКІНА А. Д.**, тэхнічнага дырэктара заводу, б. галоўнага інжынэра будаўніцтва—за энэргічную і ўмелую арганізацыю работ па будаўніцтве, сапраўднае тэхнічнае кіраўніцтва па асваеньні тэхнапёгічнага працэсу і ўмелую расстаноўку тэхнічных сіл.

3. **ПАТАПЕНКА Р. Я.**, сакратара Камітэту ЎсеКП(б) заводу—за мабілізацыю рабочых будаўніцтва на хутчэйшае сканчэньне пабудовы заводу, а ў далейшым на барацьбу за аўладаньне тэхнікай вытворчасьці і выпуску трактараў.

4. **СІТНІЧЭНКО А. І.**, намесьніка тэхнічнага дырэктара заводу, б. нам. галоўнага інжынэра будаўніцтва заводу—за правільную арганізацыю работ на будаўніцтве ў зімовы час і за нястомную барацьбу па аўладаньні вытворчай магутнасьцю заводу.

5. **АЛЬБОВА П. А.**, начальніка мэхана-зборачнага цэху, б. начальніка праектнага аддзелу будаўніцтва—за ўдарную работу па праектаваньні заводу і за правільную арганізацыю работы інструментальна-зборачнага цэху.

6. **СІДАРА А. Ф.**, начальніка кавальскага цэху, былога начальніка будаўніцтва кузьні—за энэргічнае кіраўніцтва праектаваньнем і будаўніцтвам цэху і за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчага пляну цэху.

7. **МЕКСІНА Л. А.**, начальніка інструментальнага цэху—за ўдарную работу на будаўніцтве і дасягненьні цэху ў выпуску складаных інструментаў, якія раней увозіліся з-за граніцы.

8. **ТУРЧЫНА М. А.**, начальніка будаўніцтва мэхана-зборачнага цэху, цяпер інжынэра заводу—за ўмелае кіраўніцтва праектоўкай і мантажом цэху і ўдарную работу за аўладаньне тэхнікай вытворчасьці.

9. **ХОХУЛЮ В. І.**, начальніка ліцейнага цэху—за правільнае праектаваньне тэхнапёгічнага працэсу цэху і за перавыкананьне вытворчага пляну цэху.

10. **ЦЬВІФЕЛЯ Б. М.**, начальніка штамповачнай майстэрні—за шпаркае асваеньне поўнай вытворчай магутнасьці цэху, за дасягненьні ў справе вызваленьня ад імпарту і ўдарную работу цэху па паляпшэньні якасьці прадукцыі.

11. **СТОЛЯРА З. І.**, загадчыка аддзяленьнем коўкага чыгуну — за шпаркае асваеньне вытворчасьці і сыстэматычнае перавыкананьне вытворчых плянаў.

12. **КАРАТКОВА М. А.**, загадчыка вытворчасьцю зборачнага аддзяленьня мэхана-зборачнага цэху—за правільнае і ўмелае кіраўніцтва работай аддзяленьня і ўдарную работу.

13. **ЯКАЎЛЕВА Т. І.**, майстра 5-га дэфэктнага аддзяленьня — за правільную расстаноўку рабочых, умелае кіраўніцтва іх работай і за ўдарную работу па выкананьні і перавыкананьні вытворчых плянаў.

14. **МАРГУЛЯН В. В.**, работніцу-аператара на аўтаматах 4-га аддзяленьня—за ўдарную работу, сыстэматычнае перавыкананьне вытворчых заданьняў і ліквідацыю ў сваёй рабоце браку.

15. **ГРЫГОР'ЕВА Г. П.**, нападчыка мэхана-зборачнага цэху — за ўдарную работу і арганізацыю гаспадарча-разрахункавай брыгады, якая перавыканала вытворчыя заданьні.

16. **ГАКАРОВА С. К.**, каваля — за ўдарную работу і сыстэматычнае перавыкананьне вытворчых заданьняў.

17. **АСМАЛОЎСКАГА Л. С.**, штампоўшчыка кавальскага цэху—за лепшую арганізацыю сацспаборніцтва, ударніцтва і зьменна-сустрэчнага пляну, за ўдарную работу і сыстэматычнае перавыкананьне вытворчых заданьняў.

18. **КАРНЕЕВА А. П.**, каваля, арганізатара брыгады—за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчых заданьняў.

19. **СЯМЕНАВА Ф. С.**, майстра ліцейнага цэху—за ўмелую і правільную расстаноўку рабочых у сваім аддзяленьні і за сыстэматычнае выкананьне і перавыкананьне вытворчых плянаў.

20. **РАДКЕВІЧА В. Ф.**, фармоўшчыка ліцейнага цэху, брыгадзіра бэтоншчыкаў на будаўніцтве—за рэкордныя паказальнікі работы пры бэтанаваньні і шпаркае асваеньне праектных нормай фармоўкі рам.

21. **ЖЫГАЛЬЦАВА І. М.**, майстра інструментальнага цэху—за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчых заданьняў.

22. **ПОЗДНЕЕВА С. В.**, токара інструментальнага цэху—за ўдарную работу і сыстэматычнае перавыкананьне вытворчых заданьняў.

23. **ПЭЛЬКМАНА П. І.**, рабочага брыгадзіра аддзяленьня коўкага чыгуну ліцейнага цэху—за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы і паляпшэньне якасьці прадукцыі.

24. **МЫШКОВА Н. Г.**, начальніка будаўніцтва—за правільную арганізацыю і добра праведзеную падрыхтоўку будаўніцтва і праектаваньня.

25. **СВАДЖЫЯН Л.**, спэцыяліста, грамадзяніна **ПАЗШ**, былога загадчыка будаўнічага аддзелу будаўніцтва заводу—за выключную энэргію ў праектаваньні і правядзеньні будаўнічых работ.

26. **СУЕЦІНА Н. І.**, інжынэра, намесьніка загадчыка будаўнічага аддзелу—за ўдарную работу па кіраўніцтве будаўнічымі работамі і мантажом.

27. **ЧУДНЕНКО Н. Г.**, намесьніка дырэктара заводу, працуючага на заводзе спачатку будаўніцтва ў якасьці начальніка снабжэньня—за энэргічную работу па снабжэньні будаўніцтва неабходнымі матар'ялямі, якія забясьпечылі своечасовае сканчэньне будаўніцтва.

28. **АЛЬМАВА Л. М.**, былога начальніка транспартнага аддзелу будаўніцтва, у цяперашні момант начальніка снабжэньня заводу—за энэргічную пастаноўку транспартыроўкі будаўнічых матар'ялаў і абсталяваньня ў пэрыяд будаўніцтва і мантажу.

29. **ЧЭРАПАВА Д. П.**, начальніка 2-га раёну Індубуду—за ўмелую арганізацыю будаўнічых работ і датэрміновае іх сканчэньне.

30. **ЛІТВІНАВА А. Ф.**, прараба Цеплаэлектрацэнтралі—за ўдарную работу і перавыкананьне вытворчых плянаў.

31. **МАРУСІНА Г. В.**, брыгадзіра бэтоншчыкаў—за ўдарную работу і рэкордную колькасьць замесаў у зьмену.

32. **МІКУНІСА А. Л.**, каменьшчыка—за ўдарную работу і рэкордную кладку цэглы (да 9.000).

33. **ЛОСЬ І. Т.**, брыгадзіра каменьшчыкаў—за ўдарную работу і сыстэматычнае перавыкананьне будаўнічых плянаў.

34. **МІТРОШЫНА М. І.**, цесьляра брыгадзіра — за ўдарную работу і сыстэматычнае перавыкананьне будаўнічых плянаў.

35. **КІРЫКЕША Ф. Я.**, сьлёсара мантажніка—за ўдарную работу ў часе мантажу заводу і сыстэматычнае перавыкананьне плянаў мантажных работ.

36. **ЛІБЭРМАНА А. М.**, начальніка рамотна-мэханічнага цэху—за арганізацыю ўдарнай работы ў цэху.

37. **ЛІФШЫЦА Я. А.**, былога намесьніка начальніка будаўніцтва—за ўмелую і энэргічную падрыхтоўку будаўніцтва.

38. **БАРСУКОВА П. Т.**, галоўнага інжынэра 2-га раёну Індубуду—за ўмелае тэхнічнае кіраўніцтва будаўніцтвам.

39. **БІБІКАВА В. Л.**, старшыню заўкому Саюзу **РАТАП**—за арганізацыю сацспаборніцтва па асваеньні тэхнікай вытворчасьці.

40. **МЕДЗЬВЯДОЎСКУЮ М. А.**, начальніка мэдсан. кіраўніцтва будаўніцтва і заводу — за ўзорную арганізацыю мэд. санітарнага абслугоўваньня будаўніцтва.

41. **ПІТЭЛЬ В. Ф.**, ударніцу шышэльніцу ліцейнага цэху — за высокія ўдарныя тэмпы работы ў ліцейным цэху заводу.

III.

Падшэфную дывізію за сыстэматычную практычную дапамогу будаўніцтву Харкаўскага трактарнага заводу імя Серго Арджанікідзэ — узнагарадзіць ордэнам Леніна.

IV.

Занесьці на Дошку гонару Харкаўскага трактарнага заводу імя Серго Арджанікідзэ наступных арганізатараў будаўніцтва заводу:

1. **МЫШКОВА Н. Г.**, был. начальніка будаўніцтва.
2. **СЬВІСТУНА П. І.**, начальніка будаўніцтва.
3. **БРУСКІНА А. Д.**, галоўнага інжынэра будаўніцтва.
4. **ПАТАПЕНКА Р. Я.**, сакратара камітэту ЎсеКП(б).
5. **СВАДЖЫЯНА Л.**, спэцыяліста, грамадзяніна **ПАЗШ**, загадчыка будаўнічага аддзелу будаўніцтва.
6. **ЧАРНОВА Д. П.**, начальніка 2-га раёну Індубуду.
7. **БАРСУКОВА П. Т.**, галоўнага інжынэра 2-га раёну Індубуду.
8. **ВЕРАБЕЙЧЫКА**, праектоўшчыка жалеза-бэтонных канструкцый мэхана-зборачнага цэху.
9. **МАРУСІНА Г. В.**, брыгадзіра-бэтоншчыка.
10. **МІКУНІСА А. Л.**, каменьшчыка.
11. **ЛІФШЫЦА Я. А.**, б. намесьніка начальніка будаўніцтва
12. **ВОСКА В.**, сакратара камітэту ЎсеЛКСМ.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЭ.

Масква, Крэмль, 23 мая 1932 г.

Ільнаводчыя МТС і Крупскі раён прапускаюць тэрміны сяўбы ільну

Толькі 20,2 проц.

тэхкультур засеялі ільнаводчыя МТС

Паводле апошніх даных Белтрактарцэнтру, па МТС на 25 мая засеяна ўсяго 30,6 проц. яравога кліну. Усе тэрміны скачэньня сяўбы ў паўднёвых раёнах даўно мінулі. 30 мая канчаюцца яны і для паўночных раёнаў. Але-ж сяўба праходзіць усё яшчэ надзвычай марудным тэмпам, хаця апошняя пяцідзёўка (з 20 па 25 мая) і дала прырост на 14,8 проц. (на 20 мая было засеяна 15 проц.). Трэба адзначыць, што прырост ёсьць за кошт перадавых МТС. **Клімавіцкая** дала прырост за апошнюю пяцідзёўку на 42 проц., **Танежыцкая** — на 31 проц., **Жыткавіцкая** — на 22,4 проц., **Ветрынская** — на 15 проц.

Ганебна адстаюць ільнагодчыя МТС. Яны далі прырост за апошнюю пяцідзёўку ўсяго на 12,4 проц. Наогул сяўба тэхкультур па ільнаводчых МТС праходзіць марудна. Агульны плян сяўбы выкапан на 23,4 проц., ільну-ж засеяна ўсяго 20,2 проц.

Некаторыя МТС самым яўным чынам зрываюць сяўбу. **Бешанковіцкая** выканала свой агульны плян на 6,3 проц.; а па пасеве ільну — на 2,3 проц.; **Бяльніцкая** засеяла 6,3 проц.; агульнай плошчы, ільну — 0,2 проц.; **Талочынская** выканала плян сяўбы на 3,7 проц.

Задача ільнаводчых МТС — нагнаць прапушчанае ў веснавой сяўбе на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна сярод трактарных калён і трактарыстаў і правільнай арганізацыі працы, неаскладна дабіцца карэннага пералому па фронце пасеўнай.

Рашуча біць па антыільнаводчых настроях

КРУПСКІ ільнаводчы раён цэнтральнай зоны павінен засеяць у бягучую вясну 40.360 гэкт. яравых, з іх 8.500 гэкт. тэхкультур.

Тэмпы сяўбы на раёне надзвычай марудныя, нават марудней агульнарэспубліканскіх. Паводле даных НКЗБ на 15 мая, па Крупскім раёне было засеяна 9,1 проц., на 20 мая — 14,1 проц. Прырост усяго толькі на 5 проц., у той час, як па БССР прырост складае 9,2 проц.

Асабліва ганебнае становішча з сяўбой ільну. На 20 мая плян сяўбы ільну выканан на 1,4 проц. Згодна дырэктыў партыі і ўраду трэба было да 20 мая скончыць сяўбу ільну на 100 проц.

Для таго, каб не чырванець за марудныя тэмпы сяўбы, раённае кіраўніцтва парашыла займацца «очковтирательством» перад Наркамземам. Наркамзему дасылаецца тэлеграма, што плян сяўбы на 15 мая выкапан на 9,1 проц., на 20 мая — на 14,1 проц. У сапраўднасьці-ж праверка паказала, што на 15 мая было засеяна 5,4 проц., а на 20 мая — 10,2 проц.

Раён з прарыву ня выйшаў і на сёнешні дзень. Ён стаіць на 21 месцы па цэнтральнай зоне. Раённыя работнікі тлумачаць адставаньне тым, што яшчэ не падсохла глеба, што позна прыходзіцца пачынаць сяўбу і інш. Аказваецца, справа ня ў глебе.

Возьмем, напрыклад, **Сакаловіцкі** сельсавет. 10 калгасаў гэтага сельсавету толькі што распачалі сяўбу. На 20 мая калгас «**Прагрэс**» засеяў толькі 10 га (замест 84), «**Шлях сацыялізму**»—8 га (замест 99), **Новы быт**»—7 га (замест 62) і г. д. Па калгасах сельсавету гуляла сваяасаблівая тэорыя — «нашы дзяды пачыналі і заўсёды атрымлівалі добры ўраджай». Парт'ячэйка, раённыя работнікі не разгарнулі належнай работы за раньнія тэрміны сяўбы. Булак гэта скарыстаў для сваёй мэты — ён агітуе за расьцягваньне тэрмінаў сяўбы, за зьніжэньне ўраджайнасьці.

Слабая работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, нежаданьне выхоўваць калгасны актыў, засьмечанасьць некаторых калгасаў клясава-варожымі элемэнтамі, праваапартуністычная практыка (у калгасах «Парыская Камуна», «Запольле», імя Будзённага і інш. не аграмаджаны асноўныя сродкі вытворчасьці) — вось сапраўдныя прычыны адставаньня раёну ў тэмпах сяўбы.

Мы чакаем ад крупскага раённага партыйнага кіраўніцтва **крутога пералому,** максымальнага фарсаваньня па поўным выкананьні пасеўнага пляну. Больш таго, **8.500 гэкт. пасеву тэхкультур прымушае нас напомніць, што іменна па сваячасовым выкананьні сяўбы ільну будзе ацэньвацца работа раённых арганізацый.**

Войцэх.

Хроніка конкурсу

ПОЛАЦАК. (Па тэлеграфу ад нашага кар.).

24 мая накравана ў сельсаветы і калгасы партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі 1.000 чал. для дапамогі ў правядзеньні веснавой сяўбы калгасам і аднаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

ЧЫРВОНЫ СЬПІС

кандыдатаў на прэміяваньне за лепшае і хутчэйшае правядзеньне веснавой сяўбы

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Калгас «**Чырвоная Гара**», Глівінскага сельсавету, 24 мая поўнасьцю скончыў сяўбу. Засеяна звыш пляну: ячменю — 3 га, аўса — 2 га і шпаніцы — 0,5 га.

Калгас «**Чырвоная Трасьцяніца**» 25 мая скончыў сяўбу яравых культур.

***

Садова-гародны саўгас «**М.-Горка**» 25 мая скончыў веснавую сяўбу. Засеяна: збожжавых — 125 проц. да пляну, сіласных — 177 проц., бульбы —105 проц., гародніны—101 проц.

Закладка парніковых рам выкапана на 127 проц.

***

ШКЛОЎ. Камуна «**Іскра**», Рыжкаўскага сельсавету, скончыла веснавую сяўбу. Засеяна 91 га, замест вызначаных плянам 79 га.

***

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу). Саўгас «**Ударнік**» 25 мая скончыў веснавую сяўбу і пераключыўся на дапамогу падшэфнаму калгасу «**Дойнічаў**» (Бабруйскі раён).

***

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу). Бабруйскі сельгаскамбінат у выніку добра арганізаванай работы і правільнага кіраўніцтва дырэкцыі камбінату 25 мая скончыў сяўбу ранніх гародных, палявых і кармовых культур. Звыш пляну засеяна 14 га гародніны, пасаджана 12 га саду. Саўгас пераключыўся на пасадку капусты і памідораў. Накіраваны брыгады з рабочых для дапамогі ў правядзеньні веснавой сяўбы саўгасу імя Леніна.

***

МЕНСК. Сяўба па Бараўскім сельсавеце, за выключэньнем позьніх культур, у асноўным скончана. Калгас імя Самарскай дывізіі, які адстае, узят на буксір перадавымі калгасамі.

Калгас імя **ДПУ**, Прыгараднага сельсавету, закончыў сяўбу ранніх яравых.

Калгас «**Чырвоны курсант**», Папярнянскага сельсавету, закончыў сяўбу яравых, раньняй гародніны і ўзяў на буксір адстаючы калгас «**Прагрэс**».

Пастановы ЦК і СНК не скарыстаны для паскарэньня тэмпаў сяўбы

ЖЛОБІН. (Наш спэцкор).

Тэрмін сяўбы для Жлобінскага раёну, як для паўднёвага, ужо даўно мінуў (20 мая). Але на 20 мая плян выканан усяго толькі на 29,2 проц.

Як ня дзіва, але саўгасны сэктар выканаў плян на 21,6 проц., у той час, калі калгасамі засеяна 28,9 проц. і аднаасобнікамі—29,6 проц.

Асноўным тормазам пасьпяховага правядзеньня сяўбы ў сацыялістычным сэктары зьяўляецца неарганізаванасьць працы, адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва, адсутнасьць масава-растлумачальнай работы сярод рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў, недавядзеньне апошніх пастаноў партыі і ўраду да шырокіх мас насельніцтва.

У саўгасе «**Пірэвічы**» яшчэ і зараз ня створаны вытворчыя брыгады, зямля абязьлічана.

Кіраўнікі **Стара-Руднянскага, Радускага** сельсаветаў, камуністы **Каротнаўскай і Мормальскай** парт'ячэек у самыя гарачыя дні сяўбы сьвяткуюць рэлігійныя сьвяты, пянствуючы па некалькі дзён. Сакратар Мормальскай ячэйкі КП(б)Б (загадчык хаты-чытальні) хату-чытальню трымае заўсёды пад замком. Мормальская сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства за выкананьне імі плянаў трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Апошнія пастановы партыі і ўраду не даведзены да шырокіх мас і таму яны яшчэ ня сталі ў раёне сродкам паскараньня тэмпаў сяўбы. Для папулярызацыі іх не мабілізован актыў раёну, партыйныя і камсамольскія ячэйкі і сельскі актыў на мясцох.

Практыка перадавых сельсаветаў (**Стрэшынскі**) паказвае, што распрацоўка пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і мясазагатоўках, калгасным гандлі і новым законе аб с-г. падатку зьяўляецца магутным ватаром для завяршэньня сяўбы праз два-тры дні. Некаторыя вёскі (Ніўкі, Каменка) ужо сяўбу скончылі. Калгас «**Шыхаў**» таксама праз адзін-два дні заканчвае яе.

Рад калгасаў раёну — «**Ударнік**», «**Новае жыцьцё**», «**Бальшавік**», якія з посьпехам выканалі пляны веснавой сяўбы, сваёй практыкай даказваюць іншым калгасам, саўгасам і аднаасобным бядняцка-сераднякам, што ўсе магчымасьці для сканчэньня сяўбы ў самы кароткі тэрмін у Жлобінскім раёне ў наяўнасьці.

Дзесяцігодзьдзе піянэрскай арганізацыі

У БАРАЦЬБЕ ЗА САЦЫЯЛІЗМ ВЫХАВАЕМ І ЗАГАРТУЕМ ТРЭЦЯЕ ПАКАЛЕНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫІ

Юным ленінцам ад бальшавікоў Беларусі—баявое прывітаньне

Трэцяму пакаленьню бальшавікоў, правадыру масы дзетвары—нашым ленінцам да 10-гадовага юбілею—баявое прывітаньне ад бальшавікоў Беларусі.

Вам, дзецям пралетараў і калгасьнікаў, што пераможна будуюць сацыялізм, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, прыдзецца канчаткова ўстанавіць камуністычнае грамадзтва.

Вы носіце імя Ўладзімера Ільліча Леніна.

Вывучайце-ж слаўны шлях барацьбы бальшавікоў за сацыялізм, выкоўваючы з сябе дастойную, здаровую зьмену камсамолу і партыі.

Дні свайго слаўнага юбілею скарыстайце для яшчэ большага загартаваньня сваіх радоў. Змагайцеся за якасьць вучобы, за сьвядомую дысцыпліну, за сацыялістычныя адносіны да працы і вучобы, за сапраўднае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК аб школе, за інтэрнацыянальна-клясавае выхаваньне дзяцей усіх нацыянальнасьцяй.

Няхай жыве дзіцячая камуністычная арганізацыя юных піянэраў імя Ўладзімера Ільліча Леніна.

Няхай жыве ЎсеКП(б) і яе правадыр тав. Сталін!

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Мацуйце піянэрскія рады!

Юныя піянэры! У дні вашага 10-годзьдзя Цэнтральны Камітэт ленінскага камсамолу Беларусі шле вам палкае камсамольскае прывітаньне.

Піянэрскі рух, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў і ленінскага камсамолу, дасягнуў вялізарных посьпехаў на фронце камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня, актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

У дні 10-годзьдзя піянэрскай арганізацыі на вас, юныя ленінцы, партыя і ленінскі камсамол ускладаюць вялікія адказьнейшыя задачы—кожны з вас павінен мабілізаваць усіх дзяцей працоўных на барацьбу за перабудову школы ў сапраўдную політэхнічную, за якасьць школьнай вучобы так, каб да канца навучальнага году ня было шводнага другагодніка. Узмацняйце палітвыхаваўчую работу ў зьвяне, атрадзе і школе.

Асноўная задача камсамольскіх ячэек і калектываў—умацаваць дзіцячы камуністычны рух падрыхтаванымі кадрамі кіраўнікоў піянэратрадаў. Кожная камсамольская ячэйка павінна вылучыць са свайго складу лепшых камсамольцаў на работу піянэратраду.

Піянэры, разгортваючы сацыялістычнае спэборніцтва, мацуйце піянэрскія рады, уцягвайце новыя дзесяткі тысяч дзяцей працоўных у піянэрскую арганізацыю.

Няхай жыве слаўнае 10-годзьдзе піянэрарганізацыі і яе непасрэдны кіраўнік—ленінскі камсамол!

Няхай жыве камуністычная партыя і яе правадыр—т. Сталін!

ЦК ЛКСМБ.

Будзьце прыкладам у вучобе і барацьбе

Юным піянэрам-ленінцам у дзень Х-годзьдзя слаўнай піянэрарганізацыі —палкае бальшавіцкае прывітаньне ад прэзыдыуму Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі.

Пралетарская дзетвара Савецкай Беларусі зьяўлялася і зьяўляецца актыўным удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва, актыўным барацьбітом за справу пабудовы сацыялізму.

У барацьбе за падрыхтоўку з дзетвары працоўных сьвядомых і актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадзтва піянэрарганізацыя адыгрывае выключную ролю. Піянэрарганізацыя за гэты час, пад кіраўніцтвам партыі і камсамолу, дала краіне тысячы падрыхтаваных палітычнапісьменных людзей, якія сёньня знаходзяцца ў радах партыі і камсамолу, паказваюць прыклады бальшавіцкіх тэмпаў на вытворчасьці, на калгасных палёх, кіруюць адказнымі участкамі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў упэўнен, што піянэры Савецкай Беларусі і надалей будуць прыкладам усім дзецям у вучобе, у барацьбе за сьвядомую піянэрскую дысцыпліну, у барацьбе за політэхнічную школу, за камуністычнае выхаваньне.

Юныя піянэры, да барацьбы за справу Леніна, будзьце гатовы!

Пад сьцягам Леніна ўперад—на барацьбу за поўную перамогу сацыялізму

Горача вітаю піянэрыю і ўсю працоўную дзетвару БССР з дзесяцігадовым юбілеем піянэрарганізацыі. Многія сотні і тысячы барацьбітоў за сацыялізм выраслі за гэтыя

Партыйнае будаўніцтва

ВЫШЭЙ БАЛЬШАВІЦКУЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ПАРТ'ЯЧЭЕК

у барацьбе за выкананьне пасеўных планаў, за рэалізацыю апошніх пастаноў ЦК і СНК

За апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой

Перадавыя партыйныя ячэйкі, якія забясьпечылі сваячасовую мабілізацыю мас на выкананьне задач трэцяй бальшавіцкай вясны, наладзілі канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва палявымі работамі, дабіліся вялікіх посьпехаў у правядзеньні сяўбы. Канкрэтныя рэзультаты баявой работы цэлага раду партыйных ячэек—у на ячасьці. Перадавыя калгасы, якія забясьпечаны цьвёрдым бальшавіцкім партыйным кіраўніцтвам, ужо выканалі праграму веснавой сяўбы. З месц паступаюць весткі аб тым, што з кожным днём усё больш і больш лік саўгасаў і калгасаў становіцца ў рады выканаўшых план пасеўнай кампаніі. Калгас **«Камбайн»** (Слуцкі раён) **да 20 мая скончыў пасеў усіх збожжавых культур.** Калгасы **«Чырвоны баец»** (Барысаўскі раён), **«Новае жыцьцё»** (Смалявіцкі раён) і цэлы рад іншых перавыканалі пасеўныя планы.

Аднак, вопыт перадавых калгасаў ня стаў яшчэ здабыткам усіх калектываў і агульнае становішча сяўбы па БССР усё яшчэ нездавальняючае. Першая і галоўная прычына такога адставаньня заключаецца ў тым, што значная частка партыйных ячэек ня здолела канкрэтна і апэрацыйна кіраваць ходам палявых работ, не забясьпечыла авангардную ролі камуністаў на вытворчасьці, не зрабіла сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва штодзенным мэтадам барацьбы за праграму трэцяй бальшавіцкай вясны.

Алесаўская парт'ячэйка (Полацкі раён) ня толькі не забясьпечыла бальшавіцкіх тэмпаў сяўбы, а нават стала на шлях апартуністычнага скарачэньня пасеўных плянаў. Партыйная ячэйка саўгасу **імя Будзённага** (Менскі раён) лібэральна адносіцца да бязьдзейнасьці гаспадарчага кіраўніцтва, не мабілізуе рабочых мас саўгасу па забесьпячэньне баявых тэмпаў палявых работ.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што раённыя партарганізацыі павінны ўзмацніць кіраўніцтва сяўбой, павінны рэзка паставіць пытаньне аб канкрэтным апэрацыйным кіраўніцтве з боку кожнай ячэйкі ходам палявых работ. Становішча сяўбы патрабуе ад партыйных ячэек неадкладнага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, перанясеньня вопыту перадавых у тыя саўгасы і калгасы, што адстаюць у сяўбе.

Задача кожнай парт'ячэйкі—ужыць самыя тэрміновыя і энэргічныя меры ў адносінах кіраўніцтва сяўбой, дабіць па таго, каб тэмпы ў самыя бліжэйшыя дні былі павышаны ў некалькі разоў. Толькі так на сёнешні дзень стаіць пытаньне на фронце барацьбы за праграму трэцяй бальшавіцкай вясны.

Кулацкія элемэнты і іх агентура—правыя і «левыя» апартуністы аказваюць узмоцненае супраціўленьне ажыцьцяўленьню мерапрыемстваў партыі, накіраваных на пасьпяховае правядзеньне сяўбы. Даць самы бязьлітасны адпор кулацкім элемэнтам і іх агентуры—правым апартуністам, выкарчаваць «лявацкія» перагібы, што мелі месца ў некаторых сельсаветах, нанесьці ўдар па прыміранцах да ўхілаў ад лініі партыі, да тых, што лібэральна адносяцца да бязьдзейнасьці некаторых гаспадарчых кіраўнікоў—адна з важнейшых умоў пасьпяховай барацьбы партыйных ячэек за ўпчыльненьне тэмпаў сяўбы, за поўнае выкананьне і перавыкананьне вытворчых праграм.

За бальшавіцкае кіраўніцтва ходам палявых работ, за ўмелае, канкрэтнае, апэрацыйнае кіраўніцтва кожным вучасткам работы, за сацыялістычныя мэтады працы на калгасных палёх!

Палітычна-масавай работы вакол сяўбы няма

Палявыя работы **ў саўгасе імя Будзённага** — цэнтральнай бульбяной станцыі (Менскі раён) праходзяць цэлымі маруднымі тэмпамі. Саўгас павінен засеяць пад бульбу 106,5 гэкт., пад авёс—61,5 гэкт. і больш 50 гэкт. пад іншыя культуры. На 22 мая засеяна толькі плошча, вызначаная пад авёс і ніводнага гэктара не засаджана бульбы. З агульнай плошчы яравога кліну ў 225 га ўзарана толькі 50 проц. Гэта ворыва адбылося выключна конскай цягавай сілай.

Трактарны парк у поле выехаў толькі 19 мая. Позны выезд трактара ў поле дырэктар саўгасу **тав. Харлап** імкнецца вытлумачыць усім вядомай, старой, прычынай, за якую хаваюцца ўсе апартуністы: — «Яшчэ не зацьвярдзела глеба, на полі гразка».

Партыйная ячэйка не паставіла рэзка пытаньня аб арганізацыі працы ў саўгасе. На сёнешні дзень рабочыя фактычна не падзелены на брыгады. Абязьлічка зьвіла тут сабе моцнае гняздо. За трактары, за расходаваньне гаручага ніхто не адказвае. Сярод трактарыстаў няма працоўнай дысцыпліны. На работу выходзяць яны з вялікім спазьненьнем.

Партыйная ячэйка ня ўжыла ніякіх мер па разгортваньні палітычна-масавай работы вакол сяўбы, не мабілізавала рабочых на пасьпяховае выкананьне праграмы палявых работ. За апошнія дні заўважана 5 выпадкаў нявыхаду на работу. Пры належнай пастаноўцы партыйна-масавай работы, пры глыбокім растлумачэньні шырокім масам рабочых палітычна-гаспадарчых задач партыі ўвесну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі падобныя факты ня мелі-бы месца.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, як мэтад барацьбы за пасьпяховае выкананьне пляну, не ўкараніліся ў штодзенную практыку работы.

Гаспадарчае кіраўніцтва саўгасаў праяўляе злачынна нядбайныя адносіны да запатрабаваньняў рабочых, да інвэнтару, да цягавай сілы. Ячэйка не паставіла рэзка пытаньня аб кіраўніцтве саўгасу, адносіцца лібэральна да яго бязьдзейнасьці, да тых ганебных тэмпаў, якімі ідуць палявыя работы.

Селькор **Чавусьнін.**

Ачышчаем пасеўны фронт ад апартуністаў

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

На 20 мая плян сяўбы па раёне выкапан толькі на 8,7 проц. Апошняя пяцідзёўка дала прырост у параўнаньні з мінулай толькі на 5,3 проц.

Абсалютна нездавальняючы ход сяўбы тлумачыцца тым, што рад партыйных ячэек і ўпаўнаважаных РК і РВК сваім кіраўніцтвам не забясьпечылі правільнай арганізацыі працы, не паставілі ў цэнтр сваёй увагі стварэньне моцных вытворчых брыгад. Партыйна-камсамольскія сілы не разьмеркаваны па брыгадах. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ня сталі штодзенным мэтадам бальшавіцкага змаганьня за пляны веснавой сяўбы. Вакол пастаноў партыі і ўраду аб загатоўках збожжа, мяса і разгортваньні калгаснага гандлю не разгорнута палітычна-масавая работа. Гэтыя важнейшыя палітычныя дакуманты партыі і ўраду не скарыстаны парт'ячэйкамі для яшчэ большага павышэньня творчай актыўнасьці мас, для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і датэрміновага сканчэньня палявых работ.

Іменна так стаіць справа ў **Бельскім, Верхачэнскім, Руднянскім** і інш. сельсаветах.

Партыйная арганізацыя **Алесаўскага** сельсавету ня стала на чале правядзеньня пасеўнай кампаніі, не мабілізавала мас на папярэдняе пасеўнай плошчы, на ўпчыльненьне тэмпаў сяўбы. Бязьдзейнасьць ячэйкі выкарысталі апартуністычныя элемэнты і скарацілі пляны пасеву ільну. Упаўнаважаны па **Сосінскім** сельсавеце тав. **Зайцаў** праявіў недапушчальную бязьдзейнасьць, не аказаў дапамогі мясцовым арганізацыям у мабілізацыі мас на пасьпяховае правядзеньне палявых работ. У гэтым сельсавеце ні адзін гэктар яшчэ не засеян збожжавымі культурамі. Надзвычай безадказна аднесьліся да сваіх задач — упаўнаважаны па **Верхачэнскім** сельсавеце — **Езавітаў** і па **Салоніцкім — Антонаў.** Яны не праявілі бальшавіцкай настойлівасьці ў фарсаваньні тэмпаў палявых работ.

Дрэнна працуюць Ветрынская і Полацкая машына-трактарныя станцыі. На 20 мая Ветрынская МТС выканала плян сяўбы толькі па 24 проц. і Полацкая — на 24,6 проц. Асабліва адстаюць Бабініцкі і Руднянскі вучасткі. Адставаньне МТС у палявых работах тлумачыцца ніўменьнем арганізаваць працу, правільна расставіць сілы, канкрэтна і апэрацыйна кіраваць кожным вучасткам.

Полацкі раённы камітэт КП(б)Б вынес пастанову аб ходзе сяўбы. Гэтай пастановай абвешчаны ўдарны штурмавы дэкаднік па ліквідацыі прарыву і датэрміновым завяршэньні сяўбы. Раён уключыўся ў конкурс на хутчэйшае правядзеньне палявых работ, на якасьць сяўбы.

Райком пастанавіў за дапушчаную бязьдзейнасьць зьняць з работы ўпаўнаважанага **Зайцава** і выключыў яго з радоў КП(б)Б. Упаўнаважанаму **Езавітаву** вынесена суровая вымова. Ён таксама зьнят з работы ўпаўнаважанага. За дапушчэньне скарачэньня пляну пасеву ільну **бюро Алесаўскай ячэйкі вынесена вымова.**

Для ўзмацненьня работы па кіраўніцтву ходам сяўбы райком мабілізаваў 100 чалавек гарпартактыву і накіраваў у сельсаветы. Разам з гэтым абвешчаны паход па масавай папулярызацыі пастаноў ЦК і СНК аб збожжа і жывёлазагатоўках, законе аб сельска-гаспадарчым падатку і разгортваньні калгаснага гандлю.

Анат. Ш.

Пад шыльдай дутых лічбаў

Саўгас **«Перамога сацыялізму»** (Хойніцкі раён) у часе бягучай пасеўнай кампаніі павінен засеяць 280 га збожжавых культур, 55 га бульбы, 635 гэкт. травяных культур, 120 га пад сіласныя культуры і 80 га кормаплодаў. На 20 мая засеяна было толькі 12 га збожжавымі культурамі, 15 гэкт. бульбай і падсеяна 41 гэкт. капюшоны. У вогуле, з усяго яравога кліну ў 2.567 га, засеяна толькі плошча, роўная 2 проц.

На працягу ўсяго пэрыяду падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай вясны **сакратар партыйнай ячэйкі Каламеец і дырэктар саўгасу Соналаў уводзілі ў зман раённыя партыйныя і савецкія органы.** Сваю апартуністычную бязьдзейнасьць і злачынныя адносіны да важнейшай кампаніі прыкрывалі дутымі лічбамі, хлусьлівымі весткамі. Аб тым, наколькі падрыхтован даны саўгас да пасеўнай кампаніі, гаворыць хоць-бы той факт, што з агульнай колькасьці 13 трактараў зараз працуе толькі тры, а астатнія стаяць з прычыны дрэннага рамонту. Саўгас мае 140 рабочых коняй, аднак, гэта цягавая сіла да палявых работ не падрыхтавана.

Партыйная ячэйка саўгасу, прафсаюзная арганізацыя і гаспадарчае кіраўніцтва яўна ігнаравалі ажыцьцяўленьне шасьці умоў т. **Сталіна.** Яны нічога не зрабілі для таго, каб праграму перамог, даную правадыром нашай партыі, правесьці ў жыцьцё і па гэтай аснове забясьпечыць пасьпяховасьць трэцяй бальшавіцкай вясны. Старшыня рабачкому тав. **Чырвонцаў** ставіць пытаньне проста: «Ва ўмовах саўгасу ажыцьцяўляць шэсьць умоў т. Сталіна немагчыма». **Гэтай апартуністычнай пастаноўцы пытаньня партыйная ячэйка не дала належнага адпору.**

Разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ні партыйная ячэйка, ні рабочы камітэт не займаліся. Камуністы, а іх тут да 18 чалавек, не зьяўляюцца перадавікамі на вытворчасьці, не зьяўляюцца прыкладам для беспартыйных рабочых. Камсамольская ячэйка, якая налічвае ў сваіх радох да 40 чалавек, таксама не дабівалася баявой работы сваіх членаў у часе падрыхтоўкі і самой сяўбы.

Хойніцкі райком КП(б)Б, абсьледаўшы становішча ходу сяўбы па саўгасе «Перамога сацыялізму», зьняў з работы сакратара парт'ячэйкі Каламейца і старшыню рабачкому Чырвонцава. Апошняму на працягу году забаронена займаць кіруючыя пасады.

Муравейка.

1-ае чэрвеня—усебеларускі дзень грамадзкага агляду маладняка-жывёлы ў саўгасных і калгасных фэрмах

Зьнішчыць хібы ў доглядзе і ўтрыманьні маладняка, выявіць вопыт і дасягненьні лепшых саўгасаў і калгасаў—баявая задача агляду

Канкрэтнымі справамі адказваюць на пастановы партыі і ўраду

Апошняя пастанова ЦК партыі і СНК Саюзу аб жывёлазагатоўках накладвае на нашы жывёлагадоўчыя саўгасы і калгасныя фэрмы выключную адказнасьць за захаваньне і гадоўлю маладняка.

Перадавыя саўгасы і калгасы БССР на пастановы партыі і ўраду адказваюць канкрэтнымі справамі. Нядаўна сьвінагадоўчая брыгада саўгасу **«Блонь»** (Пухавіцкі раён) на старонках «Зьвязды» рапартавала партыі аб тым, як яна пасьпяхова змагаецца за захаваньне веснавых апаросаў. Блоньцы не адзіны. Саўгас **«Харомцы»** (Глускага раёну) таксама ідзе ў калёне перадавых, захаваўшы звыш 1.000 парасят веснавога апаросу. Дзякуючы выключнай адданасьці калгасьніц-ударніц на чале з тав. **Варапаевым,** сьвінагадоўчая фэрма калгасу **«Адказ ворагам»** (Лёзна) выгадавала дзесяткі маладых сьвінаматак і захавала веснавы апарос.

Аднак, у значнай частцы саўгасаў і калгасных фэрм процант адыходу маладняка яшчэ недапушчальна высокі. Па саўгасах Сьвінаводу на 20 мая адыход маладняка дасягае 39 проц., а па саўгасах Малакапрамтрэсту 21,6 проц. Па асобных гаспадарках гэты процант значна вышэй.

Многія саўгасныя і калгасныя фэрмы сустрэлі веснавыя апаросы і апёсы зусім не падрыхтаванымі. Весткі з месц сьведчаць, што ў радзе саўгасаў («Івань», «Баноньі», «Ялава» і інш.) для веснавых апаросаў ня былі сваячасова падрыхтаваны як памяшканьні, так і адпаведная рабочая сіла. Патрабаваньні зоавэтмінімуму таксама яшчэ не ўкаранены ў саўгасна-калгасную вытворчасьць. Рад саўгасных калектываў («Івань», «Баноньі» і інш.) яшчэ не аўладалі тэхнікай сьвінагадоўлі і ў часе масавых апаросаў проста прыплі ў замяшаньне.

1-ае чэрвеня Наркамземам БССР абвешчана днём рэспубліканскага масавага грамадзкага агляду становішча маладняка і выкананьня пляну злучной кампаніі ў саўгасах і калгасных фэрмах.

Вылавіць хібы ў справе догляду і ўтрыманьня маладняка і пры дапамозе саўгасна-калгаснай грамадзкасьці безадкладна ўжыць канкрэтныя меры да іх зьнішчэньня—баявая задача агляду.

У часе агляду неабходна праверыць утрыманьне і скарыстаньне вытворчых сродкаў усіх відаў жывёлы, як арганізавана пасьба маладняка, вывад на пашу сьвінога стада і асабліва выкананьне пляну злучной кампаніі.

Стварэньне кармовай базы для забесьпячэньня жывёлы саўгасаў, калгасаў і калгасьнікаў—ня менш адказная задача агляду. Сустрэчнымі плянамі па сіласаваньні, сенаўборцы, калгасьнікі і рабочыя саўгасу павінны адказаць на апошнія пастановы партыі і ўраду.

Выявіць вопыт і дасягненьні лепшых саўгасаў, калгасных фэрм, асобных жывёлагадоўчых брыгад, сьвінароў і цялятніц у справе захаваньня маладняка, перадаць гэты вопыт другім—важнейшая задача агляду.

Дзень рэспубліканскага грамадзкага агляду становішча маладняка павінен ператварыцца ў масавы паход за аўладаньне тэхнікай сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

„Няма дрэнных цялят, ёсьць дрэнныя цялятніцы"

Старшая цялятніца МТФ калгасу **«Інтэрнацыянал»** (Лёзьнянскі раён) тав. **ЛЕЙБУР** даглядае 30 цялят, сабраных маладзейшых. Гэта—найбольш адказная работа ў цялятніку. Далікатныя арганізмы маладых цялятак патрабуюць пільнай увагі, ведаў справы і няўхільнага догляду. У гэтым узрось це цялят трэба выпясьціць, як маленькіх дзяцей.

Заг. МТФ пры эстонскім калгасе «Інтэрнацыянал», Лёзьнянскага раёну, тав. НІЛЕНДЭР, які дабіўся зьнімэньня адыходу маладняка да 2 проц.

Тав. Лейбур лічыць, што адыходу не павінна быць.

— Няма дрэнных цялят, ёсьць дрэнныя цялятніцы,—кажа яна. Вось быў выпадак, прывезьлі з МТФ цялятак, якія толькі што нарадзіліся. Яны былі хворыя. Адсадзіла я гэтых цялятак асобна. Яшчэ больш пільны нагляд аб кружкуў іх, такі догляд, як за хворымі дзецьмі. І без дапамогі доктара яны выздаравелі.

Сьмяецца тав. Лейбур:

— Здаровае цялё і дурань угробіць, а вось ты здолей няжывога ажывіць, ды жывым ня дай хварэць. А гэта зусім магчыма. Для гэтага трэба ведаць кожнае цялё, яго «характар», «капрызы», свавольства, трэба — дзе ўгадзіць, а дзе і характар пераламаць.

Усяго пры МТФ калгасу «Інтэрнацыянал» на 1 мая было 96 цялят-сялоетак. Стаяць яны ў трох пунктах. На другім пункце—41 штука. Даглядаюць Соп Мінка і Плаксіна А. У кожнай — асобная група цялят па ўзросце: у першай—3-4 месяцы, другой—2-3 месяцы. На трэцім пункце стаіць 25 штук, даглядае Рымэль Эмма. Цяляты ўзростам ад 4 да 6 месяцаў. Усе здаровыя, укормленасьць вышэй сярэдняй.

Гадуецца надзейнае пакаленьне МТФ, гадуюцца цяляты, якіх, паводле лёгкадумнага заключэньня вэтэрынара, ледзь не адпраўлілі над нож.

Прыклад МТФ калгасу «Інтэрнацыянал» павучальны для многіх. У звычайных умовах, у неабсталяваным «па ўсіх правілах» памяшканьні ўзорна гадуюцца і захоўваюцца ўсе цяляты. Відавочна, ніякія «аб'ектыўныя прычыны» ня могуць апраўдаць значнага адыходу маладняка, які мае месца ў радзе калгасаў. Вінаваты тут толькі людзі, якія кіруюць калгасам, МТФ і якія непасрэдна даглядаюць маладняк.

Ёсьць яшчэ асобныя хібы і на МТФ калгасу «Інтэрнацыянал». Напрыклад, працадні налічваюцца за работу па колькасьці цялят: норма—25 штук, прырост у вазе ня ўлічваецца. У гэтым вінавата праўленьне, а больш за ўсё ўпаўнаважаны Малакацэнтру тав. Язычэнка, які слаба кіруе МТФ.

Гэты і некаторыя іншыя недахопы ня могуць зьмешшыць тых вялізарных дасягненьняў, якіх дабілася МТФ па папярэдняй стада, павялічэньні таварнасьці яго (пляны на здачы малака выконваюцца і перавыконваюцца сыстэматычна). Бясспрэчным і вялікім дасягненьнем зьяўляецца факт захаваньня і прыкладнага ўтрыманьня цялят.

У гэтым у першую чаргу заслуга загадчыка МТФ—тав. **Нілендэра,** старшай цялятніцы тав. **Лейбур** і іншых цялятніц—т. т. **Соп, Плаксінай, Рымэль.** Па МТФ «Інтэрнацыянал» трэба раўняцца ўсім МТФ БССР.

А. Мінуцкі.



Кароўнік МТФ калгасу «Інтэрнацыянал», Лёзьнянскага раёну, на 200 кароў. Пабудаваны ў мінулым годзе.

ПАН МАЦКЕВІЧ АБАРОНЯЕ МЭТАД „ЦЭНТРАЛЬНАГА ТЭРОРУ"

Антысавецкая правакацыя, узьнятая ў сувязі з замахам белабандыта Гаргулава, ніці якой вядуць у французкі генштаб, скончылася поўным правалам, поўнай кампрамэтацыяй парыскай охранкі і яе дапаможнікаў сацыял-фашыстаў—абаронцаў белагвардзейшчыны. Зараз усе намаганьні буржуазнай французкай прэсы накіраваны да замятаньня сьлядоў, якія вядуць ад забойцы да генштабу і яго супольнікаў—белагвардзейцаў.

Як нам вядома, сьледзтва камісара парыскай паліцыі Эно ў Празе, накіраванае да таго, каб зрабіць з фашыста Гаргулава — «бальшавіка», а скрыць сапраўдных арганізатараў забойства, таксама пацярпела крах.

Аднак, імпэрыялісты ня спыняюцца на гэтым. Камісар Эно едзе ў Варшаву шукаць «чырвоных» доваду супроць Гаргулава. У французкай охранкі цяпер уся надзея на польскую дэфэнзыву, на польскіх спэцаў па антысавецкіх правакацыях.

Правакацыйнае забойства Думэра белабандытам Гаргулавым паслужыла для прадажных польскіх пісак сыгналам да новай антысавецкай кампаніі, да аблёваньня краіны Саветаў цэбрамі бруду. Зараз, калі французская буржуазная прэса б'е адбой, калі ўсе намаганьні яе накіраваны да затушоўваньня выкрыцьцяў «Юманітэ», на доказ масам, што за плячыма Гаргулава ня скрываецца французкая паліцыя, што ён дзейнічаў адзін,—прэса фашыскай Польшчы са скуры лезе, каб даказаць адваротнае і гэтым выратаваць «прэстыж» сваіх французскіх калег.

Фашысцкія газэты спаборнічаюць адна з другой у выдумцы розных правакацыйных нябыліц, паклёпаў і глупстваў, абы толькі даказаць, што фашыст Гаргулаў—«агент Камінтэрну» і гэтым выканаць заданьне свайго і французскага генштабаў. Чаго, чаго толькі ня выдумляецца, якія толькі вар'яцкія вэрсіі ня пішуцца і ня друкуюцца ў газэтах. Напрыклад, «дзённік» Гаргулава, «дзённік», «знойдзены» ад 17 мая зьмяшчае ўласную карэспандэнцыю ад «добра паінфармаванай» нейкай пані **Козерацкай** аб тым, што **«забойца Думэра Гаргулаў яшчэ ў 1915 годзе вучыўся ў Варшаве на мэдычным факультэце і, як камуніст, меў частыя спрэчкі са сваімі прафсарамі. Гаргулаў арганізоўваў якіясьці сходы і канфэрэнцыі, а таксама вербаваў розных асоб у камуністычную партыю. Гаргулаў быў небясьпечны камуніст».**

Трэба быць вар'ятам, каб зьмяшчаць такую хлусьню. Бо хто паверыць, што Гаргулаў у 1915 г. арганізоўваў камуністычную ячэйку, калі нават ня было яшчэ самай кампартыі Польшчы, якая створана толькі ў 1918 годзе.

У другім нумары «ІКЦ» ад 13 мая гэта фашысцкая шмата падае за довад «бальшавізму» Гаргулава заяву нейкага таямнічага пятлюраўскага афіцэра аб тым, што Гаргулаў страляў да апошняга патрона, г. зн. «паводле інструкцыі і сыстэмы бальшавікоў», бо ва ўсіх іншых замахах, зробленых не бальшавікамі, замахоўцы звычайна абмяжоўваюцца адной—дзьвюма кулямі.

Зразумела, што ўся гэта брахня прадажных фашысцкіх пісак, усе гэтыя правакацыйныя выбрыкі ня варты нават і ломанага гроша.

У апошнія часы фашысцкая прэса Польшчы, бачачы поўны правал намаганьняў французкай охранкі зрабіць Гаргулава «агентам Камінтэрну» і выгараджваньне сапраўдных ініцыятараў і арганізатараў забойства, прыступіла **да ідэалізацыі як самога забойцы Гаргулава, так і яго крывавых натхніцеляў.** Гэта ідэалізацыя фашысцкімі бандытамі пяра бандытаў рэвальвэра для нас ня нова. Варта толькі прыпомніць забойства белабандытам Кавэрдай т. Войкава, замахі белагвардзейцаў Вайцэхоўскага, Трайковіча, Палянскага ў Варшаве, калі фашысцкая прэса зараз-жа пасьля ня ганьбіла забойцаў, але наадварот, старалася прадставіць іх героямі, рась піналася аб іх патрыятызьме, «ідэёвасьці». Фашысцкая зграя, якая так прагне новага паходу на Менск і Кіеў, ужо на другі дзень пасьля забойства прэзыдэнта назвала страл Гаргулава стрэлам у Сараево і пацірала рукі ад радасьці, што прышоў нарэшце доўгачаканы момант ажыцьцяўленьня іх імпэрыялістычных плянаў.

А тут на табе,—французкая прэса б'е адбой, правал. Трэба шукаць выхаду, трэба арганізоўваць новыя правакацыі. І вось, вядомы ненавісьнік краіны Саветаў, заядлы вораг рабочых і сялян—**п. Мацкевіч-Цат** у сваёй манархічнай газэце «Слово» пачынае гэту справу з пачатку—з ідэалізацыі белабандытаў, з выхваленьня іх «гераічных учынкаў». У № 114 ад 21 мая сваёй газэты **«Слово»** ў перадавым артыкуле, разглядаючы справу забойства белабандытам Гаргулавым Думэра, ён прыроўчывае гэты замах да замаху італьянца **Орсіні** на французкага караля Напалеона III у 1858 годзе, які (Орсіні), як вядома, лічыцца сярод буржуазіі героем сваёй ідэі.

Адначасова аўтар стараецца скарыстаць гэта параўнаньне для таго, каб скрыць перад працоўнымі масамі, утаіць ваенныя падрыхтаваньні польскага і французскага імпэрыялізму да інтэрвэнцыі супроць СССР. «У 1932 годзе ніхто ў Францыі і нідзе на сьвеце не гаворыць аб узброенай інтэрвэнцыі Францыі супроць СССР. Толькі выключна савецкія газэты настаянна і ўпарта сьцьвярджаюць, што Францыя падрыхтоўвае ўзброены напад на Саветы, падрыхтоўвае для гэтага Польшчу і Румынію».

У п. Мацкевіча вельмі кароткая памяць там, дзе гэта патрэбна польскамуі французскаму генштабам. Пан Мацкевіч забывае нават тое, што яшчэ ўчора пісаў сам. Ён напэўна таксама будзе адмаўляць заўтра тое, што Гэта лёс кожнага буржуазнага прадажнага пісакі, якому «плюй у твар, ён усё будзе сьцьвярджаць, што божая раса».

Далей гэты бандыт пяра мае нахабнасьць выступіць з цьвярджаньнем, што забойства прэзыдэнта Думэра, як і ў свой час забойства белабандытам Кавэрдай т. Войкава—«гэта справа рук саміх бальшавікоў». Ня больш, ні менш.

«Гаргулаў забіў зусім не вінаватага шляхэтнага прэзыдэнта, Кавэрда забіў чалавека, які сам браў удзел у забойствах нялетніх дзяўчын. Я глыбока перакананы, што КАВЭРДА ДЗЕЙНІЧАЎ З ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ПАБУДЖЭНЬНЯЎ. ПРАЦЭС КАВЭРДЫ НЯ ВЫСЬВЕТЛІЎ ДАСТАТКОВА, ХТО ЯГО ДА ГЭТАГА ПАДБУХТОРВАЎ. ПЭЎНЫЯ І ВЕЛЬМІ ВАЖНЫЯ ДАНЬНЯ СЬВЕДЧАЦЬ АБ ТЫМ, ШТО ТУТ ДЗЕЙНІЧАЛА ПРАДПРЫЙМАЛЬНАЯ І РУХАВАЯ САВЕЦКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ. САВЕЦКІ АГЕНТ МЕЎ ТУТ СКАРЫСТАЦЬ ГАРАЧЫЯ, НЯЎРАЎ НАВАЖАНЫЯ ПАЧУЦЬЦІ ДЗІЦЯЦІ. Там у Парыжы савецкі агент дзейнічаў не іншым грунце: ён скарыстаў вар'яцкую меню сьфілітыка. АДНАК, ЗАУСЁДЫ БЫЎ ХТОСЬЦІ, ХТО ЎЛАЖЫЎ ЯМУ У РУКУ РЭВАЛЬВЭР».

Гэта выступленьне агента французкага імпэрыялізму, натхніцеля інтэрвэнцыі, асобы, якая цесна зьвязана з кіруючымі коламі фашысцкай Польшчы, не зьяўляецца пустым гукам і заслугоўвае ўвагі, каб на ім спыніцца.

Па-першае, п. Мацкевіч пацьвярджае якраз тое, што так старанна стараецца замесьці, выгараджаць французкая охранка, а іменна ўдзел у забойстве цэлай тэрарыстычнай белагвардзейскай арганізацыі.

Бандыту пяра п. Мацкевічу і тым, хто стаіць за яго плячыма, відаць так насьпешна патрэбна новая сусьветная бойня, што ён зноў выступае з благаслаўленьнем і ідэалізацыяй белагвардзейскіх бандытаў і тых самым да заахвочваньня іх да новых антысавецкіх правакацый.

Да рэчы, які даскапалы ўзор ажыцьцяўленьня «маральнага разьбраеньня» фашысцкай Польшчай, аб якім так расьпінаецца пан Залескі

Крэсавы зубр—Мацкевіч дешыцца, што працэс Кавэрды ня выкрыў сапраўдных натхніцеляў гэтага белабандыта, што Кавэрда дзейнічаў з «патрыятычных пабуджэньняў». Чыя-б карова мычала, аб «патрыятызьме» белабандыта Кавэрды, а дэфэнзыўная-б маўчала. Пан Мацкевіч дасканала ведае, хто накіроўваў руку Кавэрды для забойства Войкава. Пану Мацкевічу, адному з натхніцеляў інтэрвэнцыі супроць СССР, які яшчэ ў мінулым годзе кінуў лёзунг «цэнтральнага тэрору супроць старых бальшавікоў, кіраўнікоў савецкай краінай», лепш памаўчаць аб «патрыятызьме» і ідэйнасьці бандытаў рэвальвэру.

Выпады п. Мацкевіча супроць забітага т. Войкава зьяўляюцца нічым іншым, як заахвочваньнем усёй белабандыцкай сволачы для новых правакацый супроць савецкіх прадстаўнікоў, благаслаўленьнем наперад іх злачынстваў.

Параўнаньне ўчынкаў Гаргулава з учынкамі Кавэрды, якое робіць махровы манархіст-фашыст Мацкевіч, невыпадкова. Фашыст Гаргулаў забіў прэзыдэнта французкай рэспублікі, выконваючы гэтым задальне белагвардзейскіх правакатараў вайны «по страляць па бальшавіцкіх вараб'ёх, а біць па вышэйшых прадстаўніках буржуазных дзяржаў заграніцай». Зразумела, п. Мацкевіч ня супроць такіх форм правакацыі, калі яны даюць добрыя вынікі. Але, бачыце, правакатары інтэрвэнцыі на забойстве Думэра праваліліся. І вось п. Мацкевіч, параўноўваючы вынікі замахаў фашыста Гаргулава і фашыста Кавэрды, абараняе свае мэтады правакаваньня вайны з СССР, а іменна—**забойства прадстаўнікоў бальшавіцкай улады, выступае абаронцай «цэнтральнага тэрору» супроць старых бальшавікоў—кіраўнікоў савецкай краіны.** Гэтым артыкулам бандыт пяра Мацкевіч заклікае белагвардзейцаў ісьці на шлях Кавэрды, Палянскіх, Любарскіх.

Пралетарыят ня толькі Савецкага Саюзу, але і ўсяго свету пайчэ

Аб зьмене арт. арт. 27 і 50 Палажэньня аб сельгаспадатку на 1932 г.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

У выкананьне пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 20 мая 1932 г. «Аб парадку правядзеньня гандлю калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобных сялян і памяншэньні падатку на гандаль сельска-гаспадарчымі прадуктамі» Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

Унесьці ў Палажэньне аб сельгаспадатку на 1932 г. (Зб. Зак. Саюзу ССР 1932 г. № 30 арт. 189/б) наступныя зьмены:

1. Дапоўніць арт. 27 Палажэньня пунктам «г» наступнага зьместу.

«г) Даходы калгасьнікаў ад продажу на рынку прадуктаў сваёй с.-г. вытворчасьці не абкладаюцца с.-г. падаткам».

2. У другой частцы арт. 50 Палажэньня ... чаецца ў абкладаемы даход у суме, якая не перавышае 100 проц. астатняга абкладаемага даходу гаспадаркі (ад сельскай гаспадаркі і неземляробчых заработкаў)» замяніць словамі: «Даход гэты ўключаецца ў абкладаемы даход у суме, якая не перавышае 30 проц. астатняга абкладаемага даходу гаспадаркі (ад сельскай гаспадаркі і неземляробчых заработкаў)».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРЯБІН).

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЗ.

Усебеларуская канфэрэнцыя па складаньні другой пяцігодкі навукова-дасьледчай работы

УЗДЫМ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧАЙ РАБОТЫ—АДНА З АСНОЎНЫХ УМОЎ ЗАВЯРШЭНЬНЯ РЭКАНСТРУКЦЫІ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ Ў ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

ДЗЕНЬНІК КАНФЭРЭНЦЫІ

На вячэрнім пасяджэньні 25 мая з прывітаньнем канфэрэнцыі выступіў тав. РАК-МІХАЙЛОЎСКІ. Прамоўца ахарактарызаваў посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва БССР, вялікія задачы другой пяцігодкі—пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. У той час, як Савецкая Беларусь упэўненымі крокамі ідзе па шляху да сацыялізму, у Зах. Беларусі, у краіне шыбеніц, голаду і эпідэмій — паўтары мільёны беспрацоўных і страшэннае жабрацтва на вёсцы. Польскі фашызм душыць зараз рэшткі арганізацый беларускіх працоўных мас, узмацняе тэрор. Трохмільённая Зах. Беларусь ня мае зараз ні аднэй нежэйшай і сярэдняй школы; у апошні час фашызм пачаў паход на таварыствы беларускай школы ў Вільні і інш. гарадох. Яму ў гэтым дапамагаюць беларускія нацыянал-фашысты—Астроўскія і Луцевічы — агенты белапольскіх акупантаў.

Польскі фашызм, задыхаючыся ў ціскох крызісу, рыхтуецца да вайны супроць СССР. Для дасягненьня сваёй маты ён ужывае белы тэрор. Але дарэм на! Расьце і мацнее рэвалюцыйны рух; працоўныя Зах. Беларусі з захапленьнем глядзяць на Савецкую Беларусь, дзе шпаркімі тэмпамі будуецца новае сацыялістычнае грамадзтва.

У адказ на прывітаньне т. Рак-Міхайлоўскага акадэмік ЯКУБ КОЛАС заявіў: «БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б шпаркімі крокамі ідзе па шляху перабудовы краіны на сацыялістычны лад. У гэты-ж час у Заходняй Беларусі панове белы тэрор. Я прапаную прыняць рэзалюцыю пратэсту супроць тэрору польскага фашызму, які душыць вызвалечы рух працоўных мас Заходняй Беларусі. Прапанова прынята аднагалосна.

Пасьля тав. Коласа з прывітаньнем ад імя рабочых Германіі выступіў былы член саюзу чырвоных франтавікоў тав. БЛЮМЭР, ад АБВШ—т. КУЛІКАЎ.

На ранішнім пасяджэньні 26 мая адбываліся спрэчкі па дакладу старшыні Дзяржпляну тав. ШАПІРА. Выказаліся т. Х. ПЯТРОВІЧ (Дзяржплян), праф. ПЕРАХОД (НДІ пясной гаспадаркі), т. ВАЛАСЕВІЧ (Наркамлегпрам), праф. САПЕР (інстытут псыханэўрапэгіі), ЛОЙКА (інстытут эканоміі БАН), акад. АФАНАСЬЕЎ (агра-глебавы інстытут), тав. СЛОНІМ (інстытут прамысловасьці) і інш.

На вячэрнім пасяджэньні 26 мая з дакладам аб навукова - дасьледчай рабоце ў другой пяцігодцы выступіў прэзыдэнт БАН тав. П. ГОРЫН.

У спрэчках выказаліся т. БУРСТЫН і акад. АФАНАСЬЕЎ.

З рэфатам канфэрэнцыі выступіў дэлегат рабочых і ІТР чырвонасьцяжнага машынабудаўнічага заводу імя Варашылава.



Прэзыдыум канфэрэнцыі.

Заваёўваем прыродныя багацьці БССР

Ствараем сваю ўласную сырцовую базу

Выкананьне вялізарных задач другой пяцігодкі, завяршэньне рэканструкцыі народнай гаспадаркі на навейшай тэхнічнай базе, патрабуюць максымальнага разгортваньня навукова-дасьледчай справы ў мэтах найбольш поўнага і рацыянальнага выкарыстаньня ўсіх унутраных рэсурсаў, усіх прыродных багацьцяў краіны.

Навукова-дасьледчы інстытут прамысловасьці БССР разгарнуў значную работу. Ужо праведзен рад дасьледаў у лябараторыях, наладжаны вопыты на заводах па максымальным выкарыстоўваньні торфу, вашнякоў, па адшуканьні дадатковых мясцовых сырцовых рэсурсаў для шкляной, папяровай, гарбарнай і іншых відаў прамысловасьці.

Торф, як асноўны від сырцу

Вывучэньне і дасьледваньне торфу ідзе па дзьвёх лініях: па лініі найбольш рацыянальнага скарыстаньня яго, як апалу і па хэмічнай апрацоўцы яго.

Брыгада навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці ў першым квартале г. г. дасьледвала магчымасьці каксаваньня торфу і замены ім прывазнога коксу для вагранак нашых мэталяапрацоўчых заводаў, а таксама для частковай замены вадкага гаручага матар'ялу—нафты, што ўжываецца ў аўтатранспарце і трактарным парку.

Праф. ПРЫЛЕЖАЕЎ — дэлегат канфэрэнцыі

Дасьледы паказалі поўную магчымасьць у БССР **наладзіць заводзкі выраб торфу-коксу.**

Скарыстаньне тарфянога коксу пры выплаўцы чыгуну (згодна вынікаў праведзеных вопытаў) дало добрыя рэзультаты. Яго дзейнасьць і якасьць амаль ня ўступаюць каменнаму вугалю.

Папярэдняе вывучэньне торфамасываў БССР кажа аб мэтазгоднасьці будаўніцтва заводаў па вырабе коксу з торфу на масывах Зазер'е (Бялыніцкі раён), Слаўнае (Талочынскі раён), Стайкі (Сураскі раён) і інш. Распрацован праект пабудовы каля станцыі Міханавічы першай у БССР каксавальнай устаноўкі, якая дасьць у першым-жа годзе сваёй работы 1½ тыс. тон торфа-коксу. Пабудову меркавалася скончыць да 1 кастрычніка г.г., але несвячасовае снабжэньне будматар'яламі зрывае скончэньне будаўніцтва ў тэрмін. Вылучана камісія па выяўленьні магчымасьцяй пабудовы па торфмасыве Зазер'е ў другой пяцігодцы магутнага камбінату з гадавой прадукцыяй у 50-100 тыс. тон торфу-коксу ў год. Зараз адбываюцца вопыты па скарыстаньні тарфянога коксу для газагенэратараў.

Тарфяная сэкцыя НДІ распачала вывучэньне зусім новай і важнай праблемы—скарыстаньня торфу, як корму. Шляхам гідролізу, апрацоўкі салянной кіслатой і пчолакам можна атрымаць з торфу да 28 проц. расьлінага цукру. Вопыты кармленьня сьвіней і кароў гэтым цукрам паказалі, што ён можа з посьпехам, як корм ужывацца на фэрмах. Паўстае пытаньне аб наладжаньні заводзкага вырабу кармовага цукру з торфу. Таксама ўжо вырашана лябараторным шляхам праблема вырабу з торфу сыпірту. Брыгада тав. **Логіча** распрацоўвае пытаньне выдзяленьня з торфу бітумаў—смалы. Хэмічны аналіз паказаў поўную магчымасьць дабываньня з смалы воску, патрэбнага для вырабу правошчанай паперы, зма зачных матар'ялаў і лаку. Для правядзеньня гэтай работы трэба знайсьці неабходныя растварыцелі. Брыгада зараз адшукае найбольш танныя і эфэктыўныя растварыцелі.

Брыгада тав. **Юдэс** распрацавала пытаньне вырабу з тарфяной смалы друкарскай фарбы. Вопыты, праведзеныя ў друкарнях, пацьвердзілі каштоў насьць гэтых дасьледаў. Фарба з торфу—добрай якасьці, сабекошт яе значна ніжэй, чым іншых друкарскіх фарбаў.

Шкло—з мясцовых матар'ялаў

Сэкцыя шкла НДІ вывучае праблему замены востра-дэфіцытнага пчолаку іншымі больш таннымі вокісьлямі. З гэтай мэтай дасьледуюцца розныя горныя выкапні і гліны БССР, якія маюць шчолак, прыгодны для вырабу шкла.

Праведзены дасьледы па атрыманьні шкла з гліны, што знаходзіцца каля м. Шалашына. У хуткім часе на гуце «Пралетары» будзе ажыцьцёўлен вопыт пераводу плавільнай печы на шыхту з гэтай гліны. Вывучаюцца мясцовыя пылявідныя чыстыя пяскі для замены прывазных любарэцкіх. Лябараторныя іспыты паказалі, што ўжываньне мясцовых пяскоў паскарае плаўку шкла і паляпшае аднароднасьць сумесі. Вывучэньне вяжасьці расплаўленага магнэзавага шкла кажа аб магчымасьці замены дэфіцытнага шчолаку магнэзіяй, якая лёгка дабываецца з мясцовых даламітаў.

Папера—з торфу і дрэва

Папяровая сэкцыя НДІ распрацоўвае пытаньне выкарыстаньня асмолу ў папяровай вытворчасьці. З асмолу лёгка дабыць клей, а адкіды—трэскі—могуць быць скарыстаны, як валакністы матар'ял для вырабу паперы. Наладжаны вопыты выкарыстаньня адкідаў пільняў—стружак і інш.—для вырабу паперы.

Ужо скончаны ў лябараторным маштабе вопыты ўжываньня ў папяровай вытворчасьці ў якасьці сырцу торфу. Вопыты далі бліскучыя вынікі. Торф у будучым павінен зьяўіцца магутнай сырцовай базай для папяровых фабрык. Прычым сабекошт паперы павінен значна зьнізіцца. У будучым мяркуецца перавесьці рад фабрык на выпрацоўку паперы з торфу.

Разгорнуты дасьледы скарыстаньня крэйды ў якасьці напаўніцеля.

У барацьбе за ўраджай

Асноўнай задачай сэкцыі штучнага ўгнаеньня НДІ зьяўляецца адкрыцьцё новых мясцовых рэсурсаў для здабычы таннага штучнага ўгнаеньня ў мэтах узьняцьця ўраджайнасьці нашых палёў. У БССР ёсьць даволі моцная сырцовая база для тукавой прамысловасьці—наяўнасьць фасфарытаў (каля Крычава), крэйды (для вырабу ўгнаеньня) і торфу, які можа быць шырока скарыстаны ў тукавой вытворчасьці. Упяршыню ў СССР наладжаны вопыты атрыманьня з гэтых матар'ялаў моцнага канцэнтраванага супэрфасфату.

Праведзеныя дасьледы магчымасьцяй скарыстаньня торфу для вырабу арганічных штучных угнаеньняў далі станоўчыя рэзультаты, — атрымана высока-гатунковае ўгнаеньне з вялікім процантам азоту.

Акад. АФАНАСЬЕЎ—дэлегат канфэрэнцыі.

НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ АСОАВІЯХІМУ

Ажыцьцяўленьне адказных задач, што стаяць зараз перад Асоавіяхімам, як асноўнай грамадзкай абарончай арганізацыяй, як баявым рэзэрвам Чырвонай армії, — настойліва патрабуе перабудовы мэтадаў кіраўніцтва, рашучага ўзьняцьця якасьці ўсёй работы.

Невыстарчальнае апэрацыйнае кіраўніцтва, слабая плянавасьць зьяўляюцца адной з немалаважных прычын, якія параджалі нізкі ўзровень стану работы ў цэлым радзе зьвеньняў таварыства.

Узмацненьне жывой сувязі Цэнтральнага і раённых саветаў ААХ з пізавымі ячэйкамі, дача дыфэрэнцыяваных практычных указаньняў, якія дапамагалі-б палепшыць пласобныя канкротныя вучасткі работы, наладжаньне сыстэматычнай праверкі выкананьня даваных дырэктыў, — усё гэта павінна прыцягнуць самую сур'ёзную ўвагу кіруючых асоавіяхімаўскіх органаў.

Але з другога боку, для палепшэньня кіраўніцтва, для ўкараненьня плянавасьці, для ажыўленьня работы зусім неабходна правільная пастаноўка ўліку работы па мясцох, жывая, дзейсная інфармацыя зьнізу ўверх. Належны ўлік і інфармацыя дапамогуць цэнтральным і раённым органам больш шпарка рэагаваць на актуальныя пытаньні, якія ўзьнікаюць на мясцох, своячасова рабіць неабходныя абагуленьні, уносіць патрэбныя карэктывы ў работу. Улік і інфармацыя, нарэшце, зьяўляюцца неабходнейшай умовай для пасьпяховага плянаваньня ўсёй работы, для распрацоўкі пэрспэктыўных пытаньняў, як напрыклад, рост таварыства, рэгуляваньне сацыяльнага складу, ахоп ваеннай падрыхтоўкай працоўнага насельніцтва і г. д.

III пленум ЦС Асоавіяхіму СССР спэцыяльна падкрэсьліў важнасьць пытаньня ўліку і інфармацыі ў работе ўсёй арганізацыі. Абавязаўшы арганізацыі Асоавіяхіму **«павесьці рашучую барацьбу з папяровымі мэтадамі кіраўніцтва»**, пленум адначасова ўказаў на неабходнасьць **«наладзіць рэгулярную жывую інфармацыю зьнізу ўверх і зьверху ўніз, як важнейшую ўмову забесьпячэньня дыфэрэнцыяванага і апэрацыйнага кіраўніцтва і абмену станоўчым вопытам».**

Гэта ўказаньне пленуму ЦС Асоавіяхіму Саюзу абавязвае Беларускую арганізацыю аддаць пытаньням уліку работы і інфармацыі значна больш увагі, чым да гэтага часу.

Трэба адзначыць, што ўлік і інфармацыя, а адсюль і плянаваньне складалі ўвесь час найбольш слабы вучастак у асоавіяхімаўскіх арганізацыях і самым адмоўным чынам уплывалі на якасьць штодзённага кіраўніцтва работай.

Асабліва дрэнна гэта справа пастаўлена ў сярэдніх і пізавых зьвеньнях. Не адзінкавы выпадкі, калі райсавет ААХ дакладна паваг ня ведае, колькі членаў таварыства знаходзіцца па раёне. Ня прыходзіцца гаварыць ужо аб паасобных відах работы, якія больш цяжка паддаюцца ўліку.

Справаздачная кампанія па асноўных паказальніках дзейнасьці Асоавіяхіму праводзіцца два разы ў год. Гэта кампанія, якая патрабуе самых скарочаных тэрмінаў, аднак, звычайна недапушчальна зацягваецца. Замест месяца - паўтара, часьцей за ўсё расьцягваецца па тры-чатыры месяцы, і, значыць, у пэўнай ступені траціць свой сэнс.

Такое становішча, відома, зьяўляецца рэзультатам агульных недахопаў у арграбоце многіх пізавых і раённых зьвеньняў. Але трэба падкрэсьліць, што многія райсаветы, а за імі і ячэйкі проста па-папляванельску адносяцца да ўлікова - інфармацыйнай работы.

Для характарыстыкі стану гэтай галіны работы даволі ўказаць, што справаздачна - статыстычная кампанія па выніках 1931 году па БССР да гэтага часу яшчэ ня скончана. З прадстаўленых у ЦС Асоавіяхіму БССР справаздач многія складзены яўна незадавальняюча. У якасьці прыкладу можам прывесьці хапя-б **Парыцкі, Бялыніцкі, Рэчыцкі, Ключаўскі, Гарадзкі, Прапойскі, Барыкаўскі, райсаветы ААХ.**

Але яшчэ горш тое становішча, што наступ гадавыя справаздачы прадставілі толькі 48 раёнаў. Цэнтральны Савет Асоавіяхіму прымушан быў ужыць самыя суровыя меры ўзьдзеяньня ў адносінах да ряду райсаветаў Асоавіяхіму. Так, сакратар **Пухавіцкага** райсавету **Вінаградаў** зьнят з работы, вынесена суровая вымова сакратарам райсаветаў Бярэзінскага — тав. Корыку, Каралінскага — тав. Швэдаву, Сіроцінскага — Шацкіну, Чавускага — Елісееву, Чэрыкаўскага —Варотчанка.

Мірыцца далей з наяўным становішчам у рабоце па ўліку і інфармацыі ніяк нельга. Яно затрудняе работу цэнтральных кіруючых органаў, пазбаўляе магчымасьці своячасова падсумоўваць вопыт работы. Рэпрэсыўныя меры, прынятыя ЦС Асоавіяхіму БССР, павінны паслужыць урокам для ўсіх райсаветаў і ячэек. Асоавіяхіму. Абарончая арганізацыя павінна выразна працаваць ва ўсіх адносінах. Сацыялістычная справаздачнасьць, жывая інфармацыя — неабходная ўмова перабудовы работы Асоавіяхіму.

В. Б.

Баявымі тэмпамі ажыцьцяўляць пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК аб жывёлазагатоўках

Рэалізацыя гістарычнай пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК аб пляне жывёлазагатовак і аб мясным гандлі калгасаў, калгаснікаў і аднаасобных працоўных сялян — важнейшае зьвяно ў барацьбе за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за паляпшэньне рабочага снабжэньня.

У адпаведнасьці з гэтай пастановай СНК БССР вызначыў плян жывёлазагатовак па рэспубліцы на астатнія тры кварталы 1932 г. у разьмеры 38.000 тон жывой вагі супроць існуючага пляну ў 45.000 тон. У другім квартале павінна быць загатоўлена 13.120 тон (на 27,1 проц. менш існуючага пляну), у тым ліку па Сьвіна водкалгассаюзе — 1.040 тон, малочных таварных фэрмах — 720, іншых калгасах — 2.275, па сельснажытаварыствах — 160, ад аднаасобнага сэктару і калгаснікаў — 8.925 тон.

Плян жывёлазагатовак устаноўлены ў жывой вазе з тым, каб гаспадаркі маглі выконваць яго любым відам жывёлы. Пры гэтым падкрэсьлена, што райвыканкомы і загатоўчыя арганізацыі абавязаны дабіцца максымальнай здачы сьвіней у лік цэнтралізаванага пляну жывёлазагатовак.

Ход кампаніі па рэспубліцы ў сучасны момант, як гэта адзначана ў пастанове СНК БССР, ня можа быць прызнаны здавальняючым. На 16 мая заданьне ў адносінах да новага пляну выканана толькі на 32,8 проц. з якіх па аднаасобным сэктары на 19,4 проц., па сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах на 10,2 проц. Няма рашаючага зруху і па 21 мая. Пры рост за пяцідневку складае ўсяго 1,8 проц.

Гэта гаворыць аб тым, што ва многіх раёнах значэньне пастановы ЦК і СНК ад 10 мая не растлумачана шырокім масам калгаснікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сярэднякоў, не падкрэсьлена выключная важнасьць і неабходнасьць **поўнага выкананьня вызначанага пляну жывёлазагатовак**

У радзе раёнаў — Асіпавіцкім, Брагінскім, Крычаўскім процант выкананьня плянаў не перавышае 10. Ключаўскі раён загатовіў 14 проц. пляну, Пятрыкоўскі — 11,9 проц., Чэрвеньскі—16,6 проц. і г. д.

Па Веткаўскім раёне на 21 мая 8 сельсаветаў ня здалі ніводнага кілёграма мяса. Аб тым, як некаторыя веткаўскія арганізацыі зразумелі значэньне пастановы ЦК і СНК сьведчыць хапя-б той факт, што на нарадзе старшынь сельсаветаў і калгасаў, дзе абмяркоўваліся апошнія пастановы партыі і ўраду, пытаньне аб жывёлазагатоўках нават ня было закранута.

РВК абмежаваўся тым, што спусьціў дырэктыву ў сельсаветы і больш да гэтага пытаньня не вярнуўся. За пяць месяцаў райком партыі і райКК толькі адзін раз заслухалі даклад Загатжывёлы.

Такі-ж малюнак па радзе сельсаветаў Віцебскага, Горадзкага і Талачынскага раёну. У апошнім з кулацка - заможных гаспадарак па цьвёрдых заданьнях не спагнана ніводнага кілёграму. У Талачынскім-жа раёне па некаторых сельсаветах (Сіманоўскім) да гэтага часу плян нават за першы квартал не даведзен да паасобных двароў. Дагэтуль загатоўчыя арганізацыі не разгарнулі работы і замест арганізацыі загатовак усё яшчэ займаюцца «рэарганізацыяй». Некаторыя прыёмныя пункты даверены былым гандлярам - мясьнікам, якія падрываюць работу. Бязьдзейнасьць талачынскіх арганізацый выкарыстоўвае кулацкі элемэнт, які вядзе шалёную агітацыю за зрыў жывёлазагатовак.

Такія тэмпы пагражаюць зрывам выкананьню пляну. Вопыт такіх перадавых сельсаветаў, як Ленінскі, Чурылаўскі, Маслакоўскі, Горадзкага раёну, і многіх калгасаў, якія ў адказ на пастанову ЦК і СНК паказалі сапраўдныя ўзоры барацьбы за выкананьне пляну жывёлазагатовак пазнічэн быць максымальна пашыран.

Наркамснаб і Белзагатжывёла спусьцілі новы плян на месцы. Неабходна, каб раённыя арганізацыі ў максымальна кароткі тэрмін дабіліся давядзеньня пляну да паасобных вёсак, калгасаў і двароў.

Адначасова з гэтым павінна быць праведзена работа па кантрактацыі жывёлы з тым, каб забясьпечыць 100 проц. выкананьне цэнтралізаванага пляну ў трэцім квартале. Усю работу па кантрактацыі патрэбна скончыць да 15 чэрвеня.

Абавязак партыйных, савецкіх і калгасных арганізацый — разгарнуць шырокую работу па своячасовым выкананьні пляну жывёлазагатовак, што зьяўляецца адным з найбольш адказных вучасткаў у барацьбе за паляпшэньне снабжэньня насельніцтва. Неабходна растлумачыць калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам, што пры акуратным выкананьні пляну жывёлазагатовак яны атрымліваюць поўную магчымасьць бесьперашкоднага продажу буйнай жывёлы, сьвіней, авец, розных птушак і мясной прадукцыі сваіх гаспадарак на рынках і праз калгасныя крамы.

Гэту работу трэба ўвязаць з прапрацоўкай і рэалізацыяй пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК аб збожжазагатоўках і калгасным гандлі і новага палажэньня аб сельска - гаспадарчым падатку, мабілізуючы масы калгаснікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сярэднякоў на датэрміновае скончэньне веснавой сяўбы.

ДАЦЬ КРАІНЕ БОЛЬШ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАНЬНЯ—ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА ПРАМКААПЭРАЦЫІ БССР

У агульным таваразвароце БССР прадукцыя прамысловай каапэрацыі займае значнае месца. Прамкаапэрацыя мае 1.200 арцеляй, якія аднаюць 55.000 чал. Прадукцыя яе складае 30 проц. у адносінах дзяржаўнай прамысловасьці.

У 1931 годзе сыстэма Белпрамсаюзу выпусьціла тавараў на 139 мільёнаў руб., а ў бягучым годзе вытворчая праграма павялічана да 225 млн. рублёў.

Яркім паказальнікам тэмпаў росту прамкаапэрацыі зьяўляюцца даныя аб выпрацоўцы асноўных рочаў шырокага спажываньня. У 1929 годзе выпушчана швэйных вырабаў па 8.500 тыс. руб., у 1930 г. — на 22 млн., у 1931 г. — на 30 млн. руб., у 1932 годзе праектуецца выпусьціць тавараў на 42 млн. руб. Па тэкстыльных вырабах вытворчасьць за гэтыя гады ўзрасла з 3 млн. руб. да 16 млн., па скурана-валяльных з 13 млн. руб. да 40 млн., па мэталяапрацоўчых вырабах з 3.400 т. р. да 13.500 т. р. Вытворчасьць ганчарных вырабаў арганізавана толькі ў мінулым годзе, прычым выпушчана прадукцыі на 350.000 руб., а ўжо ў гэтым годзе ганчарныя арцелі дадуць тавараў па 2.300 тыс. руб.

Ня гледзячы на такі рост тавараў мас, прамкаапэрацыя ўсё-ж **дарэна не выкарыстоўвае вялізарных магчымасьцяй для пашырэньня вытворчасьці тавараў шырокага спажываньня, невыстарчальна змагаецца за выкананьне новых мясцовых сырцовых крыніц,** за поўнае выкарыстаньне адыходаў, уцілю, за разгортваньне таваразвароту.

Партыя і ўрад далі прамкаапэрацыйным арганізацыям зусім выразную дырэктыву—максымальна пашырыць вытворчасьць тавараў шырокага спажываньні, разгарнуць савецкі гандаль для паляпшэньня снабжэньня працоўных гораду і вёскі.

Баявое заданьне прамкаапэрацыі БССР у бягучым годзе даць такіх тавараў на 110 млн. руб., у тым ліку скурана-валяльных вырабаў на 31,5 млн. руб., тэкстыльных і швэйных на 44 млн. руб., дрэваапрацоўчых на 9.100 тыс. руб., харчовых на 8 млн. руб., мыла на 1.500 тыс. руб., галянтэрэі на 1.200 тыс. руб. і на арцелі «Дрэва-

Як ідзе выкананьне гэтага пляну? У першым квартале недадана спажыўцу 7 проц. прадукцыі па квартальным пляне. Няма бальшавіцкага разгону і ў другім квартале.

Гэта тлумачыцца тым, што барацьба за павялічэньне выпуску тавараў шырокага спажываньня — як адзін з важнейшых вучасткаў работы прамкаапэрацыі **абязьлічваецца.** Барацьба за поўнае выкананьне пляну часта вядзецца наогул, без вызначэньня канкрэтнага вучастку, канкрэтных задач.

Ёсьць нават такія абураючыя факты, калі вытворчая праграма ня толькі не пашыраецца, але нават скарачаецца. Арцель «Дрэваапрацоўшчык», напрыклад, зьменшыла выпуск крэслаў з 16 тузінаў у дзень да 4 тузінаў толькі таму, што кіраўніцтва арцельлю і дрэваапрацоўчае аб'яднаньне Белпрамсаюзу не паклапаціліся набыць некаторыя дэталі. У крамах цяжка знайсьці нажы, а ў арцелі «Чырвоны мэталіст» валяецца пад адкрытым небам 10 тон сырцу, прызначанага для выпрацоўкі нажэй. Бітоны для газы не выробляюцца толькі таму, што праўленьне гэтай арцелі марудзіць з рамонтам штампу.

Гэтыя некалькі фактаў ужо гавораць аб тым, што дырэктыва партыі аб пашырэньні выпуску тавараў шырокага спажываньня па лініі прамкаапэрацыі выконваецца далёка не пабаявому. Работа ў многіх зьвеньнях вядзецца па старыцы.

Пастанова ўраду аб пераключэньні работы пэўнай часткі арцеляй на індывідуальнае абслугоўваньне заказчыкаў выконваецца таксама з выключнай павольнасьцю.

Менпрайпрамсаюз і праўленьне арцелі «Чырвоны абутнік» да гэтага часу ня вызначылі пунктаў для адкрыцьця майстэрань і магазынаў для прыёму індывідуальных заказаў. Спэцфонды, адпушчаныя для гэтай мэты, могуць аказацца нявыкарыстанымі. У арцелі «Чырвоны мэталіст» рад цэхаў стаіць, а праўленьне мардуздіць з пераключэньнем арцелі на індывідуальныя заказы, на выпуск і рамонт прымусаў, алюмінійных лыжак, талерак, вёдзер і г. д.

Такі ж малюнак і на арцелі «Дрэва-апрацоўшчык», якая ў выніку рацыяналізатарскіх і раду іншых мерапрыемстваў пераключылася на вытворчасьць мыла з мясцовага недэфіцытнага сырцу і гэтым самым унікла закрыцьця арцелі, — трэба пашырыць па ўсе вытворчыя зьвеньні прамкаапэрацыі.

У сьвятле гэтых фактаў заслугоўвае ўвагі пытаньне аб разгортваньні раздробнага гандлю прамкаапэрацыі.

XVII партканфэрэнцыя падкрэсьліла, што «для забесьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў уздыму ўсёй народнай гаспадаркі і лепшага задаволеньня запатрабаваньняў шырокіх мас гораду і вёскі ў адносінах тавараў шырокага спажываньня, першаступовае значэньне мае разгортваньне таваразвароту».

На 1932 год па лініі Белпрамсаюзу павінна быць адкрыта 40 магазынаў і 36 ларкоў. У першым квартале плян па магазынах рэалізован на 85 проц., па ларках — на 45 проц. Таксама і ў другім квартале. Заданьне па таваразвароту выкананa раздробным гандлем у першым квартале ўсяго на 48 проц.

Сур'ёзным тормазам у разгортваньні гандлю прамкаапэрацыяй зьяўляецца інэртнасьць і коснасьць раду работнікаў сыстэмы. У многіх з іх глыбока засела пераконаньне, што раздробны гандаль—ня справа прамкаапэрацыі, што ўсё гэта справа часовага характару. Ілюстрацыяй такіх шкодных тэндэнцый можа служыць заява кіраўніка тэкстыльаб'яднаньня Белпрамсаюзу тав. **Шварца,** па думцы якога разгортваньне раздробнага гандлю... правы апартунізм.

З недаацэнкай сэнсу і значэньня раздробнага гандлю ў прамкаапэрацыі трэба пакончыць, у першую чаргу, у апараце самога Белпрамсаюзу і яго аб'яднаньняў.

Рэалізацыя пляну таваразвароту ў значнай ступені залежыць ад выкананьня дагавораў, заключаных паміж раздробным гандлем і вытворчымі зьвеньнямі. На жаль, дагаворная сыстэма ўкараняецца вельмі слаба. Райпрамсаюзы ня лічаць для сябе абавязковым заключэньне дагавораў унутры сыстэмы прамкаапэрацыі. Ігнараваньне дагаворных адносін прывяло да таго, што Менск не атрымаў мэблі на некалькі сот тысяч рублёў толькі таму, што Менпрайпрамсаюз ня лічыў для сябе патрэбным заключыць дагавор з бабруйскімі дрэваапрацоўчымі арцелямі.

Адсутнасьць дагаворных адносін прыводзіць да таго, што раздробны гандаль ня можа ўплываць на асартымэнт і якасьць тавараў. Да гэтага часу няма амаль ніводнай крамы, ларка, якія-б гандлявалі коламазьзю, шчаночнымі вырабамі, дзёгцем, дравесным вугалем, вепікамі, шчоткамі і г. д. Між тым, вытворчасьць гэтых тавараў, на якіх ёсьць вялізарны попыт, асабліва з боку вёскі, можа быць шырока разгорнута, бо яна не патрабуе дэфіцытнага сырцу. Некаторыя арцелі імкнуцца выраблять больш дэфіцытныя і рэнтабельныя тавары і вельмі часта ня лічацца з інтарэсамі спажыўца.

Раздробны гандаль прамкаапэрацыі трэба праводзіць па аснове пашырэньня практыкі дагавораў з вытворчымі зьвеньнямі з тым, каб ператварыць іх у сапраўдную зброю, якая забясьпечвала-б рэальнасьць выкананьня пляну таваразвароту.

Сыстэме прамкаапэрацыі неабходна ва ўдарным парадку перабудаваць сваю работу ў галіне раздробнага таваразвароту, мабілізаваўшы ўсе свае магчымасьці і ўсе свае сілы на выкананьне і перавыкананьне пляну. Самацёк і інэртнасьць на такім важным вучастку работы прамкаапэрацыі павінны быць безадкладна ліквідаваны.

Прамкаапэрацыя павінна адкрыць свае гандлёвыя пункты на савецкіх рынках, у рабочых раёнах, на заводах, фабрыках, у саўгасах, на новабудоўлях, арганізаваць сапраўднае культурнае абслугоўваньне рабочага і калгасьніка.

Барацьба за тавары шырокага спажываньня, за выяўленьне і выкарыстаньне новых багатых крыніц, павінна быць узьнята на патрэбную вышыню. Трэба з усёй жорсткасьцю змагацца супроць апартуністычных элемэнтаў у прамкаапэрацыі, якія аказваюць супраціўленьне ў ажыцьцяўленьні гэтай задачы.

Трэба ўзяць пад кантроль работу арцеляй, якія выпускаюць тавары шырокага спажываньня, растлумачваць членам арцеляй палітычнае значэньне гэтай работы і на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. **Сталіна** змагацца за поўнае выкананьне і перавыкананьне вытворчай праграмы.

Укараненьнем шасьці ўмоў тав. **Сталіна** ва ўсе зьвеньні прамкаапэрацыі, у рашучай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі трэба дабіцца ліквідацыі ўсіх тормазаў і поўнасьцю асвоіць новую павялічаную праграму выпуску тавараў шырокага спажываньня.

Міх. Кін.

Справядлівая настарожанасьць

Засолачны пункт у мінулым годзе знаходзіўся на Мала-Татарскай вул. Работа на пункце не адпавядала правілам санітарыі. Пад засолку гуркоў і капусты МЦРК выкарыстоўваў бруднымі бочкі з-пад селядцоў, якія па году валяліся на задніх дварох, мыліся проста халоднай вадой. Спажыўцы, якія ў гэту зіму елі цэрабіцкіяўскія гуркі і капусту, ня раз скардзіліся на іх дрэнную якасьць.

Але ў мінулым годзе, між іншым, загатоўцы харчовых прадуктаў гаварылі, што «сёлета нас гэта работа застала непадрыхтаванымі, а ў будучым годзе справа будзе пастаўлена «па яць».

Засолачны пункт будуецца на рацэ Сьвіслач супроць б. Татарскай вуліцы. Будуецца харчова-загатоўчая вытворчасьць ніжэй стокаў нячыстот ад фабрык і заводаў: 1-й цукровай і лямцавай фабрык, водачнага і піваранага заводаў. На Пярэсыпе з ракой злучаецца канава, якая ідзе з балотнай станцыі. Далей гэта канава праходзіць міма заразьлівай больніцы і прымае ў сябе бруд з усяго раёну Старажоўкі.

Прыступаючы да будаўніцтва такога адказнага прадпрыемства, трэст Белплодагародніны не палічыў патрэбным стварыць аўтарытэтную спэцыяльную санкамісію для ўсебаковага абсьледваньня прыгоднасьці месца пад засолачны пункт.

Аб гарачым мыцьці і запарцы тары няма і намёку. Няма яшчэ спэцыяльных запарачных чанаў. Няма артэзіянскіх студняў, а аднэй студні мала, бо задачы гэтага пункту вялікія. Трэба засаліць 2.000 тон гуркоў, 280 тон памідораў і замачыць 150 тон яблык. Самае малае неабходна мець тры артэзіянскія студні.

Адказныя за будаўніцтва гэтага пункту гавораць, што яны будуць праводзіць водаправод і будаваць тры запасныя артэзіянскія студні. Але да гэтага часу на пункце **няма яшчэ ні аднаго мэтру труб і ня відаць нават падрыхтоўкі да будаўніцтва артэзіянскіх студняў.** Відома, што пры адсутнасьці студняў будуць карыстацца водой з рэчкі. А якая гэта вада? Жыхары ваду для піцьця з рэчкі не бяруць, бо ў ёй заўсёды плывуць асьлі лыя гніючыя часткі па ўсёй рацэ. Летам, іменна ў часе засолкі, ад рэчкі нясецца смурод і гэтай смуроднай водой ніяк нельга заліваць гуркі і капусту.

Усе гэтыя факты выклікаюць справядлівую настарожанасьць у рабочага спажыўца ў адносінах да будучай якасьці салёных гуркоў.

А. Оршын.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя лічыць неяходным, каб гарсавет неадкладна склаў санітарную камісію для агляду месца будаўніцтва засолачнага пункту і праверыў, якія мерапрыемствы ўжыты ў справе захаваньня неабходных правіл санітарыі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Супроць разгрому ТБШ,

СУПРОЦЬ ЛІКВІДАЦЫІ РЭШТАК БЕЛАРУСКАГА ШКОЛЬНІЦТВА У ЗАХ. БЕЛАРУСІ

Пратэст усебеларускай канфэрэнцыі навуковых працаўнікоў

Заслухаўшы інфармацыю тав. **Ракіміхайлоўскага аб разгроме польскай дэфензывай адзінай у Зах. Беларусі** легальнай культурна-асьветнай арганізацыі **рабочых і сялян—Таварыства Беларускай Школы**, аб масавых арыштах членаў ТБШ і ліквідацыі беларускай культурна-асьветнай справы **—усебеларуская канфэрэнцыя навуковых працаўнікоў** рашуча пратэстуе супроць азьвярэлага паходу польскага фашызму на беларускую культуру і нацыянальна-вызваленчы рух у Зах. Беларусі.

Задыхаючыся ў атмасфэры экачамічнага крызісу, польскі імпэрыялізм ахопле гарачкай ваеннай падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР. Зьніжаецца зарплата працоўным, ліквідуюцца мізэрныя рэшткі сацыяльных заваёў, сыплюцца новыя бязьмерныя падаткі. Новая хваля вайсковага асадніцтва накіроўваецца на акупаваныя польскім імпэрыялізмам Зах. Беларусь і Зах. Украіну. Палявымі судамі, шыбеніцамі, карнымі экспэдыцыямі і катаваньнем палітзьняволеных імкнецца азьвярэлы фашызм задушыць магутны рост рэвалюцыйнай хвалі.

Пад шырмай рэвалюцыйных працоўных мас, **здраднікі нацыянальна-вызваленчага руху Зах. Беларусі — Астроўскі, Луцкевіч, Акінчыц**, як верныя агенты белапольскіх акупантаў, вымушаны прызнаць сваё паражэньне. Усе намаганьні фашызацыі ТБШ праваліліся. Рабоча-сялянскія масы Зах. Беларусі гераічна адбіваюць усе атакі акупантаў.

Польскі фашызм прыступіў да канчатковай ліквідацыі культурна-асьветнай справы працоўных. Лепшых рэвалюцыйных рабочых і сялян арыштоўваюць, катуюць, судзяць і кідаюць у турмы на павольнае выміраньне.

Усебеларуская канфэрэнцыя навуковых працаўнікоў заяўляе, што ў БССР ёсьць 49 навукова-дасьледчых інстытутаў і зональных станцый, 32 вышэйшыя навучальныя ўстановы, сотні тэхнікумаў, рабфакаў і тысячы пачатковых школ, у якіх сотні тысяч пралетарскіх дзяцей вучацца на сваёй роднай мове, тады, як у Польшчы закрываюцца ўсе беларускія пачатковыя школы, ліквідаваны беларускія гімназіі ў Гарадку, Радашковічах і Клецку і беларуская настаўніцкая сэмінарыя ў Вільні. Польскі фашызм вядзе цяпер наступленьне на апошнія дзьве гімназіі—у Вільні і Навагрудку. Нядаўна **канфіскавана і закрыта на першым нумары адзіная рабоча-сялянская газэта «Беларускае жыцьцё» ў Львове.**

Разграміўшы масавую рабоча-сялянскую «Грамаду», задушыўшы беларускую культурна-асьветную працу, зьліквідаваўшы канчаткова беларускае школьніцтва, адзіную легальную арганізацыю ТБШ і прэсу, польскі фашызм спадзяецца зьнішчыць у корані шырокі рэвалюцыйны рух на Зах. Беларусі, каб **расчысьціць сабе плацдарм для нападу на СССР.** Польскі фашызм бачыць выхад з эканамічнага крызісу ў вайне з Савецкім саюзам.

Салідарызуючыся з рэвалюцыйнымі працоўнымі масамі Польшчы, Заходняй Беларусі і Зах. Украіны, **мы, навуковыя працаўнікі БССР, патрабуем ад польскіх «цывілізатараў»-акупантаў спыніць паход супроць ТБШ і беларускага школьніцтва. Мы ганьбім здраднікаў працоўных мас—Астроўскіх, Луцкевіча і Акінчыца — верных служак польскага фашызму.** Мы патрабуем вызваліць здрадніцка-кінутага за краты акад. **тав. Тарашкевіча, рабоча-сялянскіх дэпутатаў Зах. Беларусі т. т. Валошына, Дварчаніна, Гаўрыліка, Валынца, Крынчыка і ўсіх палітзьняволеных рабочых і сялян.**

Усім вязьням капіталу, ахвярам польскага фашызму шлем гарачае пралетарскае прывітаньне.

Прэч польскіх фашысцкіх акупантаў, душыцеляў рабочых і сялян Зах. Беларусі!

Няхай жыве рэвалюцыйная нацыянальна-вызваленчая барацьба рабочых і сялян Зах. Беларусі!

Няхай жыве КПЗБ—арганізатар працоўных мас у барацьбе за вызваленьне з бела-панскага ярма!

Адначасова мы заклікаем працоўных ня толькі БССР, але і ўсяго Савецкага саюзу ўзьняць магутны голас пратэсту супроць канчатковай ліквідацыі ТБШ і культурна-асьветнай справы працоўных мас Зах. Беларусі.

Скарочаны бюджэты Лоеўскага і Прапойскага раёнаў

за сыстэматычнае недавыкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Прымаючы пад увагу, што Лоеўскі і Прапойскі раёны, ня гледзячы на шматлікія папярэджаньні, сыстэматычна недавыконваюць свае пляны мабілізацыі сродкаў і заданьні па паступленьні дзяржаўных плацяжоў з агрэмаджанага сэктару, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Скараціць бюджэт 1932 г. Лоеўскага раёну на 40.000 руб., а Прапойскага — на 50.000 руб.

2. Папярэдзіць Бешанковіцкі, Старадарожскі, Сураскі, Сяньненскі і Нараўлянскі раённыя выканаўчыя камітэты, што калі імі ня будуць ужыты напоўнены захады да ліквідацыі дапушчаных у выкананьні плянаў другога кварталу прарываў, дык і да гэтых раёнаў будуць ужыты аналягічныя меры фінансавай узьдзейнасьці.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР А. КАЛНІН.
Кіраўнік спраў СНК і ЗКАНА БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

Арганізуйце збор кніг

Да ўсіх навуковых работнікаў БССР

Цэнтральны Камітэт ленінскага камсамолу пастанавіў правесьці на гарадох і прамысловых раёнах СССР збор кніг для вёскі. Гэта мерапрыемства знайшло актыўнае падтрыманьне з боку нашага лепшага пралетарскага пісьменьніка тав. **Максіма Горкага**, які першым у адказ на заклік камсамолу прапанаваў забраць у яго некалькі соцень кніг і зьвярнуўся да савецкай грамадзкасьці з просьбай падтрымаць надзвычай актуальны пачын камсамолу.

Цэнтральнае бюро сэкцыі заклікае ўсіх навуковых работнікаў прыняць актыўнейшы ўдзел у справе, пачатай камсамолам.

Рост культурных запатрабаваньняў нашай вёскі, які зьяўляецца вынікам магутнага ўздыму ўсёй народнай гаспадаркі, патрабуе дасыльки ва ўсе куткі нашай вялікай краіны тысяч кніг, часопісяй, брашур. У кожнага з вас, бязумоўна, ёсьць кніг, якія вы можаце сабраць для пасылкі на вёску.

Здавайце гэтыя кнігі, арганізуйце самі збор кніг, дапамажэце камсамолу ў адборы сапраўдных карысных, ідэалягічна вытрыманых кніг, якіх чакаюць калгасьнікі і працоўныя сяляне.

Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых работнікаў выказвае ўпэўненасьць, што навуковыя работнікі БССР і мясцовыя арганізацыі сэкцыі па-ўдарнаму дапамогуць у выкананьні адказнага палітычнага мерапрыемства, якое праводзіцца ленінскім камсамолам.

Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых работнікаў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Сёньня, 28, в 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда» (трэці паверх, Савецкая, 63) адбудзецца:

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ШТАБУ САДЗЕЙНАСЬЦІ РАЗГОРТВАНЬНЮ КАЛГАСНАГА ГАНДЛЮ Ў МЕНСКУ.

Парадак дня:

1. Аб вывазьдзе калгасьнікаў на рынак 29 мая і падрыхтаванасьці да гэтага кааперацыйна-гандлёвых арганізацый Менску.

2. Інфармацыя аб ходзе работы па адкрыцьці калгасных магазынаў пры прадпрыемствах.

На пасяджэньне павінны зьявіцца: члены штабу—прадстаўнікі: БЕЛКАЛ. ГАСЦЭНТРУ, НАРКАМЗЕМУ, ГАРСАВЕТУ, ГАРПРАФСАВЕТУ, БЕЛГАНДЛЮ, ГАРСНАБУ, РАЙКАЛГАССАЮЗУ, МЕНАДДЗЯЛЕНЬНЯ ПРАМКААПЭРАЦЫІ.

Яўка АБАВЯЗКОВА для старшынь ЗРК: заводу «Бальшавік», «Мэталіст», абутковай фабрыкі, «Кастрычнік», друкарні імя Сталіна і будаўнікоў, а таксама прадстаўнікоў МЦРК, Менкамгасу і аб'яднаньняў Белкаапсаюзу.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА».

— Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 29 мая, ў 10 гадз. раніцы (Менск, Савецкая, 55) на пасяджэньні ЦКК будуць разглядацца партсправы т. т.: Крычаўцова Б. Я. (Чаўсрск. арт.), Мацусенкі І. І. (Клімавіцк. раён), Драздова М. М., Зайцава В. К., Захарэвіча Г. Р., Піткевіча Г. Г., Губерта Б. Ю., Малкарова Б. С., Курбацкага І. П., Салаўёва А. Я., Пагодзіна П. Х., Фінкельштэйна Г. С., Сакаўца В. П., Сучкова І. М., Паварэтнага Д. С., Міхайлава І. Н., Макеньякова Я. М., Фрэйкіна (Лесаспабзыт), Мішкаўца М. І., Беларусава Е. Т., Гайдаш Л. Н. Яўка пералічаных таварышоў абавязкова. Выкліканыя таварышы павінны прадставіць у ПК ад партячэек водзывы аб апошняй сваёй рабоце ў ячэйцы, на вытворчасьці і г. д. Праезд не аплачваецца.

— **Усім парткалегіятам і ячэйкам КП(б)Б.** У сувязі з неабходнасьцю скалькуляваньня ўсёй увагі партгрупаў на скончэньне веснавой сяўбы, гарадзкая канфэрэнцыя парторгаў пераносіцца на 5 чэрвеня 1932 г.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

Прэзыдыум ЦП і рабочыя саюзу машынабудаўніцтва Беларусі выказваюць глыбокі жаль з прычыны сьмерці старшыні ЦК саюзу машынабудаўніцтва

тав. КІРКІЖА.

Дому Камасьветы
патрэбен
рахункавод.
Можна і па сумяшчальнасьці.

28-V, у 7 гадз. веч., у Інстытуце філёсофіі і БАН (пак. 10, 2-гі паверх) адбудзецца
агульны сход ТВМДБ
разам з Інстытутам філёсофіі: абгаварэньне кнігі „Матэрыялёгія трацкізму". Яўка членаў ТВМДБ абавязкова.

Беларускай канторы „Радыёстроя"
патрэбны:
машыністка-справавод,
рахункавод па разьліках з рабочымі.
Заявы падаваць: ст. Калодзішчы, МБВ чыг., п-ку „Радыёстроя".

ВЫШЭЙШАМУ Пэдагагічнаму Інстытуту
ПАТРЭБЕН
інжынэр-кіраўнік вытворчай практыкі.
Аплата па згодзе.
Зьвяртацца па адрасе: г. Менск-Універсытэцкі гарадок, галоўны корпус, 2-гі паверх, пакой 231.

28 мая, у 7 гадз. вечара, у ДОМЕ ПІСЬМЕНЬНІКА адбудзецца
адкрытае пасяджэньне інстытуту літаратуры і мастацтва БАН.
Будзе заслухан даклад т. КАГАНЕЛЬСОНА на тэму: „Матэрыялёгія інструкцыйнай і навукова-тэхнічнай фільмы".
Запрашаюцца для абгаварэньня: крытычныя сэкцыі літаратурных аб'яднаньняў, працаўнікі друку, кіно і ўсе жадаючыя.

Кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
ТОЛЬКІ 2 ДНІ 29 І 30 мая
ДЗЯНЫЯ КАНЦЭРТЫ ЭСТРАДЫ
БЕЛДАМЭЦА
ПА ВЯЛІКАЙ ШКАВАЙ ПРАГРАМЕ
ВОЛЬСКІ—сатыра. МАСЬЛЕНІКАЎ—сьпевы. ІГАРАВА—сьпевы. Узунова-Хераско—балет. ТЭЛЕНБАУМ—скрыпка. КАСТАНТ—акрабаты.
Ля раяля—ЖЫЎ.
ШТОДЗЕННА 2 ПАКАЗЫ.
Пачатак І паказу а 1 гадз. дня. „ II „ а 2 гадз. 30 м.
КАСА—ад 11 гадз.
Дзеці праходзяць пры дарослых або двое на 1 білет.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА
новы мастацкі фільм вытворч. СЛЮЗКІНО
Марцін ВАГНЭР
Рэжысэр УСЕВАЛОД МАСІНО.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Гукавы гістарычна-мастацкі фільм **МЁРТВЫ ДОМ**
ПРАЛЕТАРЫ — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **КНЯЖНЯ МЭРЫ** Драма ў 8 ч.

Кіно „СПАРТАК" — З 28 мая гістарычны фільм **Крыльлі халопа**
Трагэдыя ў 9 частках.
Штодзенна 4 сэансы: у 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 30 м. і 11 гадз. Каса—з 5 гадз.

Гарсавет вынаходцаў паведамляе, што сёньня, 28-га мая, роўна у 7 гадзін вечара, у „Доме Тэхнікі" (б. клюб „КІМ-у", Камсамольская вул.) адбудзецца
пашыраны пленум гарсавету вынаходцаў
З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
1. Вынікі 2-дзяднёвіка праверкі рэалізацыі рацпрапаноў і далейшыя задачы ячэек (даклад нач. старшыні Рэспубліканскага савету вынаходцаў т. Даўбэр).
2. Выбары прэзыдыуму гарсавету вынаходцаў.
Яўка старшынь бюро БРЫЗ-у і ячэек вынаходзтва абавязкова.

СЁНЬНЯ, 28 мая, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні нэрвовай клінікі (вул. Валодарскага, 16) АДКРЫВАЕЦЦА
УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПСЫХА-НЭЎРАЛЁГІІ

Ашчэ спроба перафарбаваць белабандыта ў чырвоны колер

Гаргулаў абвяргае паказаньні ілжэсьведкі

ПАРЫЖ, 24. Паводле паведамленьня друку, сёньня судзьдзя-сьледчы ФУЖАРЫ дапытваў ГАРГУЛАВА ў сувязі з дакладам прыбыўшага з Чэхаславакіі паліцэйскага камісара ЭНО, а таксама ў сувязі з заявамі «сафійскага палкоўніка СЬЛІПАТАВА», які, як вядома, даводзіў, быццам Гаргулаў працаваў у ЧК на Каўказе». Судзьдзя-сьледчы ўказаў, што, паводле слоў Сьліпатава, апошні сустракаў Гаргулава ў 1918 годзе ў г. Хасак-Юрце, дзе «Гаргулаў быў сакратаром бальшавіцкага камісара Сігантэра і прымаў удзел у расстрэлах ня менш як пяцьдзесяці». ГАРГУЛАЎ НА ГЭТА АДКАЗАЎ, ШТО ГЭТА ПРАВАКАЦЫЯ, ШТО ЁН НІКОЛІ НЯ ВЕДАЎ НІ СЬЛІПАТАВА, НІ СІГАНТЭРА І НЯ БЫЎ У ХАСАК-ЮРЦЕ. На запытаньне, ці правільны сабраныя паліцэйскім сьледствам даныя аб тым, што «бацька» Гаргулава быў расстрэлян белымі ў станіцы Лабінскай у ліпені 1918 г., Гаргулаў адказвае, што бацька яго быў расстрэлян бальшавікамі. «Ён быў багатым упасьнікам, — заяўляе Гаргулаў, — а я быў яго насьледнікам. ЧАЧЫЦЕ, ТАКІМ ЧЫНАМ НЕМАГЧЫМА, КАБ Я БЫЎ БАЛЬШАВІКОМ».

Далей Гаргулаў адхіляе версію быццам ён быў «начальнікам аховы прэзыдэнта Дагестанскай рэспублікі і прымаў удзел у расстрэле белых афіцэраў». Ён указвае, што ў гэты час быў у Лабінскай. На ўказаньні Сьліпатава аб тым, што генэрал Ляхаў ва Уладывастоку загадаў павесіць Гаргулава, апошні ўцёк, Гаргулаў адказвае, што НІКОЛІ ЁН ВА ЎЛАДЫВАСТОКУ НЯ БЫЎ. Гаргулаў прызнае, што ў 1920 годзе ён быў вядомы ў Растове-на-Дану пад прозьвішчам Донскага, тлумачачы, што гэта быў яго літаратурны псэўдонім. Ён адмаўляе, што ў верасьні 1921 г. быў у Тыфлісе ў «якасьці бальшавіцкага агента, які дзейнічаў пад імем Дубоўскага». Ён заяўляе, што гэта правакацыя, абвяржэньнем якой можа служыць яго студэнцкі білет. Далей ён абвяргае паведамленьне Сьліпатава, быццам Гаргулаў быў вясной 1921 году ў Канстантынопалі.

У дакладзе Эно ёсьць указаньне, быццам Гаргулаў перайшоў польскую граніцу ў ліпені 1921 г. пры дапамозе пагранічніка, сына яго былога кватэрнага гаспадара ў Растове. Гаргулаў заяўляе, што сям'я яго не магла прайсьці граніцу, бо цесьць яго быў манархістам, САМ-ЖА ЁН ПЕРАЙШОЎ ГРАНІЦУ ПРЫ ДАПАМОЗЕ ЧЛЕНА САВІНКАЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІ ПЕРАПРАВІЎ ЯГО Ў СЯЛЯНСКУЮ ВОПРАТКУ.

Далей Гаргулаў указвае, што атрымаў пашпарт для пераезду ў Прагу ў 1921 годзе ПРЫ ДАПАМОЗЕ БЕЛЫХ ЭМІГРАНТАЎ. Ён быў дапушчан у праскі унівэрсытэт дзякуючы дапамозе аднаго былога растоўскага прафэсара, у якога вучыўся. Ён называе правакацыйнай заяву Сьліпатава аб тым, што расстраляў на Каўказе групу ў 19 манархістаў, указваючы, што ў гэты час ён быў у Празе. (ТАСС).

„Паказаньні Гаргулава зьяўляюцца шчырымі"

ПАРЫЖ, 25. Сьледчы пасьля допыту шчыраў, што паказаньні Гаргулава супадаюць з другімі крыніцамі: «Я пераканаўся,—заявіў ён, — што паказаньні Гаргулава зьяўляюцца шчырымі». «Матэн» паведамляе: сьледчы лічыць, што сьледзтва амаль скончана. Чакаецца псыхіятрычная экспэртыза.

Новы склад кіруючых органаў т-ва Чырвонага Крыжу БССР

3-ці ўсебеларускі зьезд Чырвонага Крыжу выбраў новы склад ЦК т-ва з 65 чалавек.

У прэзыдыум ЦК выбраны наступныя таварышы: **Богуш, Беркоўскі, Багдановіч, Борц, Гурэвіч, Караедаў, Якуб Колас, Карняюк, Нікіфарава, Хацкевіч, Лазоўская, Хурсанаў і Цэнцыпэр**; кандыдатамі: **Ганіч, Собаль, Біруля і Ільлюшына**; у рэвіз. камісію — **Кац, Гібкін, Комар і Хайкін.**

Старшынёй ЦК т-ва Чырвонага Крыжу БССР выбран **тав. Хацкевіч.**

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Звышвысокавольтны кабель з новых сплаваў

Заводам Электраправод (Масква) выпушчан жалеза-альдрэевы кабель для перадачы току напружаньнем у 380.000 вольт.

Асваеньне вытворчасьці гэтага кабелю, у асаблівасьці-ж складанай апрацоўкі дроту з альдрэя (новы від сплаву — буйная перамога.

Выраблены кабель па сваёй канструкцыі і па ўжытых мэталях зьяўляецца першым ня толькі ў СССР, але і першым у сьвеце.

Кабель адзначаецца вялікай моцнасьцю, таннасьцю і дае эканомію ў каляровых мэталях.

Першая савецкая целавымяральная ўстаноўка

Ленінградзкі завод «Электрапрыбор» сканструяваў і пабудаваў першую ў СССР целавымяральную ўстаноўку для перадачы ўказаньняў электраприлад на вялікую адлегласьць. Устаноўка цалкам зроблена з савецкіх матар'ялаў і па якасьці ня ўступае заграніччым.



Новая маслабачыстка № 3 па выробе аўтолаў (прадукцыйнасьць 120 т. у суткі) на Грозьненскім нафтаперагонным заводзе.

Машынабудаўніцтва

Менскі чырвонасьцяжны завод імя Варашылава за 20 дзён мая выпусьціў 26 сьвідравальных варштатаў, 18 гравіясартовак, 2 камнядробілкі, 1 торфамашыну, запасных частак да торфмашын па 6.138 руб. Усяго выпушчана прадукцыі на 92.770 руб.—18,5 проц.

Сельгасмашыны

Заводам Гомсельмаш 23 мая выпушчана 21 сячкарня, што складае **113 проц. пляну**, 4 канюшынасартоўкі — **100 проц.** і 32 сіласрэзкі «Папэж» — 97 проц.

***

Завод «Чырвоны мэталіст» за 5 дзён мая (з 18 па 23) выпусьціў 116 карнарэзак, што складае **111,9 проц. пляну**, 87 макухадробілак — **104,2 проц.** і 109 бульбакапалак — **85,6 проц.**

Торф

24 мая ўсімі заводамі Белторфаб'яднаньня здабыта 1.551 тоны торфу, што складае 21,7 проц. дзённага заданьня.

Паасобныя заводы далі наступныя паказальнікі: «Закрашынскі мох» здабыў 167,4 тоны — 78 проц. пляну, «Шлях сацыялізму» — 426,7 тоны — 30 проц., Асінторф — 576,2 тоны — 27,7 проц., «1-га мая» — 97 тон — 26,9 проц., Смалявічы—103 тоны — 19,3 проц., «Свабода» — 16 тон — 6 проц. і «Чырвоная Беларусь» — 25 тон — 5,4 проц. заданьня.

Будматар'ялы

Завод «Чырвоны Кастрычнік» за другую дэкаду мая выпусьціў 50 тон будаўнічых цьвікоў, што складае 29 проц. месячнага пляну.

За 22 і 23 мая выпушчана 4.880 кгр. будаўнічых цьвікоў — 35,4 проц. заданьня.

***

За чацьвертую пяцідзеўку мая заводам **«Інтэрнацыянал»** выпусьціў 3 485 кгр. шрубаў — 97,3 проц. пляну.

21 мая выпушчана 883,5 кгр. шрубаў — 95,4 проц. пляну і 258,3 кгр цьвікоў — 42,9 проц.

***

Дрэваапрацоўчы камбінат «Кажінтэрн» за 23 і 25 мая расьпілаваў 337,5 кбм. сырцу, што складае 97,9 проц. заданьня.

***

Рагачоўскі лесазавод імя Халтурына за 20 і 21 мая расьпілаваў 512,7 кбм. сырцу — 88,5 проц.

Рамонт вагонаў

Заводам «Полымя рэвалюцыі» з 13 па 26 мая выпушчана з канвэйцыйнага рамонту 43 вагоны і 4 вагоны з аварыйнага рамонту.

Папера

Паперовая фабрыка «Спартак» за 22, 23 і 24 мая выпрацавала 52,6 тоны паперы, што складае 87,3 проц. заданьня.

***

Пасьля частковага перапыпку, выкліканага перабоямі ў дастаўцы торфу, 12 мая фабрыка «Чырвоная зорка» адновіла работу. Былі пушчаны дзьве машыны.

За другую дэкаду мая выраблена паперы 72,6 тоны, што складае 24,7 проц. пляну, 21 мая выпрацавана 13,5 тоны — 41,4 проц. і 22 мая выпрацавана 28,6 тоны — **87,7 проц.**

***

Папярозная фабрыка «Герой працы» за 22 мая выпусьціла 55,8 тоны паперы, што складае 68,5 проц. сутачнага заданьня (21 мая плян быў выканан на 75,9 проц.) і 10 тон саломенай цэлюлёзы — 84 проц. пляну. **Прастой машын склаў 69 гадз., замест прадугледжаных плянам 9 гадзін.**

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Японскі пасол у Бэрліне аб савецка-японскіх адносінах

БЭРЛІН, 25. У сувязі з трывожнымі паведамленьнямі германскай прэсы аб пагрозе японска-савецкай вайны, прадстаўнік «японскага таварыства ў Германіі» дабіўся інтэрв'ю з японскім паслом у Бэрліне **Обата.** Апошні заявіў:

«Ходам разьвіцьця манчжурскіх падзей японскія войскі ў Манчжурыі былі вымушаны прадпрыняць як у Харбіне, так і ў ваколіцах гэтага гораду ваенныя апэрацыі супроць разасланых рэштак разьбітых кітайскіх войск для таго, каб абараніць жыцьцё і маемасьць японскіх прэзыдэнтаў паўночнай Манчжурыі. Пры гэтым, однак, японскі ўрад заўсёды дакладна падкрэсьліваў аб тым, каб паважаць законныя інтарэсы Савецкага саюзу гэтым раёне і не наносіць страты. Гэта факт, у якім лёгка пераканацца, калі прасачыць ваенныя апэрацыі Японіі. Акрамя таго, японскі ўрад ня раз заяўляў савецкаму ўраду, што адзінай мэтай апэрацый нашых войск у Паўночнай Манчжурыі зьяўляецца абарона мясцовых японскіх рэзыдэнтаў і што гэтыя апэрацыі ня маюць ніякіх іншых мэт. Мы ўпэўнены, што савецкі ўрад, са свайго боку, таксама гэта разумее.

Однак, з пэўных крыніц распускаюцца злосныя чуткі, якія зводзяцца да таго, што быццам непасрэдна пагражае небясьпека сутычкі паміж гэтымі суседнімі дзяржавамі. Сапраўдная мэта пашырэньня такіх чутак можа быць толькі ў тым, каб садзейнічаць узьнікненьню гэтай злоўмысной сутычкі з тым, каб выцягнуць з яе карысьць і лавіць рыбу ў мутнай вадзе, або ў тым, каб ажыцьцявіць свае ўласныя пэўныя патаемныя замыслы».

СКЛАД НОВАГА ЯПОНСКАГА ЎРАДУ

ТОКІО, 25. Закончыліся перагаворы аб складзе ўраду Сайто. У склад новага кабінету ўвайшлі наступныя асобы: прэм'ер-міністар **Сайто**, міністар унутраных спраў **Тацуо Ямамото** (звязан з партыяй сейюкай), міністар фінансаў **Такахасі** (займаў пасаду міністра фінансаў у кабінэце Інукаі, член партыі сейюкай), ваенны міністар **Хансі** (камандуючы карэйскай арміяй), морскі міністар адмірал **Оскада** (займаў пасаду морскага міністра ў кабінэце Тамака), міністар юстыцыі **Кояма** (член мінсэйто), міністар асьветы **Хатояма** (займаў пасаду міністра асьветы ў кабінэце Інукаі, член партыі сейюкай), міністар зямляробства **Хомію Гото** (член верхняй палаты, прыхільнік мінсэйто), міністар гандлю **Нагэзіма**, міністар пошты і тэлеграфу **Хіроссі Мінамі** (член партыі сейюкай, пэрадтым быў назначан генэрал-губэрнатарам Фармозы), міністар чыгунак **Міцуці** (член партыі сейюкай, займаў пасаду міністра пошты і тэлеграфу ў кабінэце Інукаі), міністар калёній **Нагаі** (генэральны сакратар мінсэйто).

Абавязкі міністра замежных спраў часова ўскладаюцца на Сайто. (ТАСС).

Максім Горкі заклікае рабочых паскорыць стварэньне „Гісторыі заводаў"

МАСКВА. **Максім Горкі** зьвярнуўся да рабочых 26 заводаў і фабрык, гісторыя якіх павінна быць запісана ў першую чаргу на працягу 1932-33 г., з наступным лістом:

«Дарагія таварышы!

Цяпер, калі работа па гісторыі фабрык і заводаў разгарнулася на сотнях прадпрыемстваў, не патрабуецца доказваць яе вялізарнага палітычнага значэньня. Там, дзе яна пастаўлена як масавая палітычная работа, яна дае каштоўнейшыя разультаты ў сэнсе палітычнага выхаваньня новых пластоў рабочай клясы. Правільна гаворыць таварышы, працуючыя над гісторыяй аўтазаводу імя Сталіна, што работа над гісторыяй заводу—гэта особная форма кампазу. Правільна гаворыць газэта Бальтыцкага заводу, калі яна абвяшчае працэс стварэньня гісторыі заводу працэсам ленінскай вучобы. На радзе заводаў ёсьць шэсьцёрочныя дасьпгненьні ў гэтай работе. Але я лічу неабходным адзначыць, што работа ідзе ў вельмі неўдасканаленых формах і вельмі марудлівымі тэмпамі. Гісторыя вашага заводу павінна быць скончана ў 1932 г. (гляджэце пастанову рэдакцыі гісторыі заводаў «Правда» і «Известия» ад 10 красавіка). Гэта задача будзе выканана толькі пры ўмове новага ўзмацненьня работы.

Парткомы заводаў і вылучаныя імі рэдакцыйныя камісіі павінны неадкладна прыняць усе меры да таго, каб работа пасунуць справу наперад і забясьпечыць стварэньне кніг у намечаны тэрмін. Сувязь таварышоў, працуючых над гісторыяй вашага заводу, з галоўнай рэдакцыяй, яшчэ невыстарчальная. Неабходна яе ўмацаваць. Галоўная рэдакцыя павінна мець выразную карціну работы на мясцох, тады яна зможа аказваць канкрэтную дапамогу.

Найбольш пашыранае зьявішча—гэта няўменьне перайсьці ад работы па зборы матар'ялу да самой творчай працы над кнігай. Неабходна паладзіць гэты працэс пераходу да творчай работы. Для гэтага неадкладна трэба прыступіць да стварэньня літаратурных груп, што аб'яднаюць усіх таварышоў, якія маглі-б калектывам узяцца за напісаньне кнігі, прынялі-б на сябе адказнае абавязацельства—скончыць работу ў дакладна ўстаноўлены тэрмін, заключылі-б з галоўнай рэдакцыяй дагавор, каб абумовіць у у гэтым дагаворы ўсе мерапрыемствы, што забясьпечваюць выкананьне работы. Часу застаецца мала. У ранейшых формах і ранейшымі тэмпамі працаваць нельга. Прашу таварышоў абгаварыць пытаньне аб стане работы па гісторыі нашага заводу і зрабіць усе неабходныя вывады. Адказ прашу накіраваць у галоўную рэдакцыю па магчымасьці неадкладна. Нам хацелася-б ведаць:

1. У якім становішчы знаходзіцца ў сучасны момант работа над гісторыяй.

2. Што мяркуецца зрабіць для узмацненьня работы ўласнымі сіламі.

3. Якая дапамога патрабуецца ад галоўнай рэдакцыі.

Член галоўнай рэдакцыі «Гісторыі заводаў» **Максім Горкі.**

Абвяржэньне ТАСС

ТАСС упаўнаважана заявіць, што паведамленьне ў артыкулах Сэп-Брыс у парыскай газэце **«Журналь»** аб мінулым пасяджэньні Палітбюро ЦК 12 мая, на якім нібы абмяркоўвалася пытаньне аб ганьбіцкіх справах, і дзе Палітбюро нібы пастанавіла «адкрыць крэдыт у паўмільёна марак і заклікала германскую кампартыю ўзмацніць рэвалюцыйную работу ў Данцыгу»,—зьяўляецца спачатку да канца пахабнай хлусьнёю. Гэта паведамленьне, роўна як і ўсе іншыя паведамленьні Сэп-Брыс у «Журналь» аб пасяджэньнях Палітбюро, ня мае ні аднаго слова праўды і сфабрыкавана насумнена з правакацыйнымі антысавецкімі мэтамі.

Разультаты выбараў у Эстонскі парлямант

ТАЛІН (Рэвэль), 25. Выбары ў эстонскі парлямант далі наступныя разультаты: аграрыі атрымалі 194.000 галасоў і 40 месц у парляменце; нацыянальна-дэмакратычны цэнтр — 110.000 галасоў і 23 мандаты; сацыял-дэмакраты — 104.000 і 22 мандаты; левая група — 25.000 і 5 мандатаў; «рускі нацыянальны саюз» — 25.000 і 5 мандатаў; немцы — 15.000 і 3 мандаты; працоўнае аб'яднаньне — 9.000 і 2 мандаты.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Галоўлітбел № 337